ПРАДУКТЫ Ў СВАЮ ТАРУ **5**

ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ГЕПАТЫТУ **9**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 СНЕЖНЯ 2018 г. СЕРАДА № 239 (28855)

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ПАРТНОЙ, намеснік міністра спорту і турызму:

«Па даных на 29 лістапада, магчымасцямі 30-дзённага бязвізу ў нашу краіну скарысталіся 178 640 чалавек. Больш за ўсё турыстаў прыехала з Германіі (28,5 тысячы), Польшчы (16,3 тысячы) і Італіі (15,6 тысячы). Таксама ў топ-10 краін увайшлі Вялікабрытанія, ЗША, Францыя, Нідэрланды, Латвія, Швецыя, Літва. Па бязвізе Гродна і беларускую частку Аўгустоўскага канала з пачатку гэтага года наведалі больш за 83 тысячы іншаземцаў, Белавежскую пушчу і турысцка-рэкрэацыйную зону «Брэст» — больш за 15,2 тысячы замежных грамадзян. Экспарт турыстычных паслуг у Беларусі за студзень — верасень 2018 года вырас на 14,3 % да $170,9 млн. Больш за палову экспарту прыпала на Расію — $99,2 млн, далей ідуць Аўстрыя, Кітай, Кіпр і Германія».

Дзе снегавік, там і свята

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Уласнымі сіламі супрацоўнікі Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Светач» Савецкага раёна сталіцы падрыхтавалі і выставілі на парозе навучальнай установы вулічную скульптуру вялікага снегавіка — як сімвал навагодніх і калядных свят. Намеснік дырэктара ўстановы Алена СОЛТАН *(на здымку ў цэнтры)* і супрацоўнік Дзмітрый БУКАЦІЧ упрыгожваюць гэты святочны твор, які будзе радаваць навучэнцаў і прахожых ажно да сярэдзіны студзеня.

КАРАТКА

- **Цэнтральныя банкі Еўропы спыняць выпуск самай буйной банкноты ў еўра (500), каб знізіць узровень злачыннасці.**
- Колькасць ДТЗ з удзелам дзяцей знізілася ў Гомелі з 12 выпадкаў у студзені — кастрычніку 2017-га да 9 за аналагічны перыяд сёлета.
- **Стаматалогія, афтальмалогія, дыягностыка і пластычная хірургія — самыя запатрабаваныя паслугі медыцынскага турызму ў Гродне.**



- Польшча прыме ў 2019 годзе дзіцячае «Еўрабачанне», конкурс стане сямнаццатым па ліку.

ЛЁД ХРУСЦІЦЬ ПАДМАНЛІВА...

З першага зімовага лёду сёлета дадому не вярнуліся тры чалавекі. 30 лістапада ў Добрушскім раёне два браты ўзялі санкі і пайшлі пакатацца на раку Іпуць. У нейкі момант лёд хруснуў — і абодва малыя апынуліся ў ледзяной вадзе. СТАР. 3

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Высокая перспектыва

ХТО ГАЛОЎНЫ Ў АБЛОКАХ?

Беларусь мае шанц заняць месца на адным з самых перспектыўных рынкаў планеты

Неверагодна, але факт: традыцыйныя крылатыя машыны саступаюць неба беспілотным лятальным апаратам (БЛА). Прычым гэта адбываецца настолькі хутка, што праз нейкія дзесяць-пятнаццаць гадоў, як прадказваюць многія спецыялісты, пілатаваная авіяцыя адыдзе ў гісторыю.

Магчыма, падобныя прагнозы крыху паспешлівыя, але мы не можам не верыць сваім вачам: беспілотнікі знаходзяць усё больш шырокае прымяненне. Іх паспяхова выкарыстоўваюць для патрулявання лясоў з мэтай прафілактыкі пажараў, пошуку зніклых людзей і тэхнікі, у метэаралогіі і правядзенні радыялагічнага аналізу мясцовасці, сельскай гаспадарцы, ваеннай справе. З'явілася інфармацыя аб тым, што дроны вось-вось пачнуць дастаўляць пошту, а ў недалёкай будучыні — працаваць у якасці паветраных таксі. Карацей кажучы, перспектывы ў такіх апаратаў бязмежныя. СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

АГАРОДЖАЎ НАМ НЕ ТРЭБА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Германіі ў Беларусі Петэрам Дэтмарам. Адной з асноўных тэм перагавораў стала адкрыццё еўрапейскага рынку беларускім кампаніям, якое, на жаль, пакуль даецца не так проста.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што традыцыйна сустракаецца з пасламі, якія працуюць у нашай краіне, каб разумець перспектывы адносін Беларусі з важнымі для нас дзяржавамі, адной з якіх з'яўляецца і Германія. Прэзідэнт падкрэсліў: «Германія нас вельмі цікавіць у сувязі з тым, што, па-першае, немцы нас разумеюць, успрымаюць. Па-другое, гэта тэхналагічная, магутная краіна, і мы зацікаўлены ў інвестыцыях і тэхналогіях вашай краіны. А таксама ў нас існуе шэраг іншых інтарэсаў, пра якія я гатовы з вамі сёння пагаварыць».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што чакае ад гэтай сустрэчы поўнай яснасці, чаго б Германія хацела ад Беларусі. «І я шчыра вам скажу, што мы б хацелі атрымаць ад Германіі і ад Еўрасаюза», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што наш прынцып адзіны — з суседзямі, якім з'яўляецца і ЕС, трэба будаваць адносіны і жыць нармальна.

Прэзідэнт падкрэсліў, што не трэба ставіць Беларусь перад выбарам: Захад ці Усход? Наша краіна будуе мірную палітыку, зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў і ўлічваючы інтарэсы нашых суседзяў. «Мы ніколі не станем асяродкам напружанасці ў Еўропе», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

«Мы ніколі не будзем праблемай для Еўрапейскага саюза, у тым ліку і для Германіі. Тое ж самае мы б хацелі ад Германіі. Мы хочам, каб Германія, разумеючы нас, рабіла канкрэтныя крокі насустрач. Гэта ж ненармальна, калі мы — адкрытая краіна для ўсяго Еўрапейскага саюза, а нават гандляваць з вамі не можам, бо вы агароджу выставілі. І нават да агароджы нікога не падпускаеце. Горш, чым у Трампа з Мексікай сцяна выбудаваная. Толькі яна нябачная, эканамічная. Таму мы б хацелі, каб нарэшце знялі гэтыя агароджы і, калі Еўрапейскі саюз так прыхільны да рыначнай эканомікі, дык чаго ж адгароджвацца», — выказаў сваё меркаванне Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы пра палітычныя і эканамічныя адносіны, пасол Германіі Петэр Дэтмар заўважыў, што гэты год найбольш паспяховы і важны ў нашым двухбаковым супрацоўніцтве. Пасля размовы з Прэзідэнтам спадар пасол пракаментаваў, што неабходна ідэнтыфікаваць прыярытэтныя кірункі ўзаемадзеяння дзвюх краін, перш за ўсё, у сферы эканомікі. У шэраг галін, якія цікавяць, уваходзіць захаванне пазітыўнага інвестыцыйнага клімату Беларусі. Важна, каб і далей адносіны Беларусі і ЕС развіваліся канструктыўна і паспяхова.

Надзея АНІСОВІЧ.

РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ СПАРТСМЕНАЎ

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з міністрам спорту Расіі Паўлам Калабковым. Нядаўна былі знятыя абмежаванні на ўдзел беларускіх спартсменаў ва ўсерасійскіх спартыўных спаборніцтвах па хакеі. Тым часам маюцца аналагічныя праекты нарматыўна-прававых актаў па зняцці абмежаванняў у баскетболе, водным пола, валейболе, гандболе, рэгбі, хакеі на траве і з мячом, футболе. Праз некалькі тыдняў гэтыя дакументы павінны ўступіць у сілу. Гэтую і іншыя тэмы абмеркавалі суразмоўнікі.

Кіраўнік дзяржавы гасцінна павітаў Паўла Калабкова, адзначыўшы яго дасягненні ў спартыўнай кар'еры. Прэзідэнт звярнуў увагу на пытанне легіянерскага статусу беларусаў у чэмпіянаце Расіі. «Я дзякую вам, што ў нас ёсць рух у прыраўноўванні беларусаў да расіян, каб тут не было адрозненняў. Па хакеі быццам бы вырашылі праблему, але, я думаю, трэба рухацца і па іншых відах спорту. Нам не трэба баяцца, што будуць думаць іншыя дзяржавы, калі яны хочуць мець роўныя правы, трэба ўступаць у Саюз Беларусі і Расіі, тады будуць роўныя правы для спартсменаў і гэтак далей, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта добры прыклад, і ў гэтым напрамку рухацца трэба. Тым больш я не думаю, што мы праблемы нейкія, нават маленькія, гэтым самым ствараем для расіян».

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Хачу, каб у нас складваліся добрыя адносіны. Дапамога нам патрэбна будзе перад Алімпіядай, асабліва па базах, трэба нашых алімпійцаў трэніраваць там, ва Уладзівастоку. Я думаю, вы і самі там будзеце рыхтавацца. Усё ж такі бліжэй да Японіі (летнія Алімпійскія гульні 2020 года пройдуць у Токіа. — **Аўт.**). Калі нешта трэба расіянам... Хоць вельмі шмат прыязджае дзетак вашых, і дарослыя каманды, і хакейныя, і іншыя на нашы базы трэніраваць. І іх задавальняюць тыя ўмовы, якія тут створаны. У нас ніколі не было ніякіх пытанняў і перашкод для гэтага».

Да таго ж учора адбылося чарговае пасяджэнне калегій Мінспортаў Беларусі і Расіі. На ім абмеркавалі правядзенне сумесных збораў у рамках падрыхтоўкі да Другіх Еўрапейскіх гульняў і іншыя пытанні, а таксама падпісалі Праграму супрацоўніцтва ў сферы фізічнай культуры і спорту паміж профільнымі міністэрствамі на 2019—2020 гады.

Па словах Паўла Калабкова, расійскія спартсмены расказвалі пра якасць беларускіх спартыўных аб'ектаў і спаборніцтвы высокага ўзроўню, якія на іх праводзяцца. Яны з задавальненнем праводзяць зборы ў Беларусі. «З кожным годам павялічваецца колькасць спартсменаў, якія прыязжаюць як з Беларусі ў Расію, так і расіян, што тут трэніруюцца. Найперш адзначаем высокую якасць». Таксама Калабкоў згадаў добрыя кантакты з беларускім калегам. Пасля размовы з Прэзідэнтам ён дадаў для журналістаў: «Я даўно не быў у Мінску. І прыемна, што сапраўды вельмі шмат робіцца для спорту. Горад надзвычайна прыгожы, шмат добрых спартыўных збудаванняў».

Надзея АНІСОВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Уступкі Макрона «жоўтым камізэлькам» могуць абысціся казне Францыі ў 10 мільярдаў еўра

Фінансавыя меры, на якія пагадзіўся прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон у адказ на масавыя пратэсты «жоўтых камізэлек», абыдуцца дзяржказне ў суму «ад васьмі да дзесяці мільярдаў еўра». Пра гэта заявіў дзяржсакратар па дзяржслужбе пры Міністэрстве эканомікі і фінансаў Францыі Аліўе Дзюсопт. Ён таксама ўдакладніў, што ў выпадку абяцанай Макронам даплаты ў 100 еўра да мінімальнага памеру штомесячнай зарплаты гаворка ідзе пра суму за вылікам усіх падаткаў і збораў.

Выступаючы 10 снежня са зваротам да нацыі, французскі прэзідэнт заявіў, што бярэ на сябе «частку адказнасці» за цяперашні крызіс. Кіраўнік дзяржавы паабяцаў, што ў 2019 годзе не будзе павышаны ўзровень сацыяльных збораў з пенсіянераў, даходы якіх складаюць менш за 2000 еўра ў месяц. Аплата працы ў звышурочныя гадзіны таксама не будзе абкладацца падаткамі, дадаў ён.

Павышэнне мінімальнай зарплаты было адным з ключавых патрабаванняў пратэстнага руху «жоўтых камізэлек». Акцыі пачаліся ў лістападзе з-за намеру французскіх уладаў увесці падатак, які прывёў бы да павышэння цэн на аўтамабільнае паліва. Пасля таго як урад у Парыжы зацвердзіў мараторый на рост паліўных падаткаў, мітынгоўцы сталі пратэставаць у цэлым супраць рэформаў урада і прэзідэнта краіны.

У Крамлі пракаментавалі скасаванне Украінай дагавора аб дружбе

У Крамлі шкадуюць аб рашэнні Украіны скасаваць дагавор аб дружбе, які быў падпісаны ў 1997 годзе, паведамляе ТАСС.

«Можна выказаць толькі шкадаванне ў сувязі з тым, што ўкраінскае кіраўніцтва прымае такія неабдуманыя рашэнні. З нашага пункту гледжання, гэта з'яўляецца праявай непавагі да свайго ўласнага народа, да яго інтарэсаў», — сказаў прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў.

10 снежня прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка заявіў, што закон аб спыненні дзеяння дагавора аб дружбе, супрацоўніцтве і партнёрстве з Расіяй падпісаны. Раней, 6 снежня, Вярхоўная рада падтрымала накіраваны прэзідэнтам законапраект.

CNN: Трамп усур'ёз баіцца магчымасці абвяшчэння яму імпічменту

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп у размовах са сваімі памочнікамі выказвае асцярогі адносна магчымасці абвяшчэння яму імпічменту пасля таго, як Палата прадстаўнікоў Кангрэса пяройдзе пад кантроль дэмакратаў у наступным годзе. Пра гэта паведаміла тэлекампанія CNN са спасылкай на сваю крыніцу ў Белым доме.

Паводле яе звестак, Трамп адкрыта выказваў заклапочанасць з нагоды таго, што дэмакраты, у чыіх руках ужо ў студзені апынецца кантроль над ніжняй палатай Кангрэса, запусцяць працэдуру імпічменту ў дачыненні да прэзідэнта. Як адзначыла крыніца, Трамп лічыць, што імпічмент «па-сапраўднаму магчымы», аднак абсалютнай упэўненасці на гэты конт у яго пакуль няма.

У Мінску адкрыта пасольства Судана

Беларусь высока цэніць рашэнне суданскага кіраўніцтва аб адкрыцці дыппрадстаўніцтва ў Мінску, заявіў прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС падчас адкрыцця пасольства Рэспублікі Судан у Рэспубліцы Беларусь, перадае карэспандэнт БелТА.

Фота БелТА.

«Мы шчыра рады, што на адкрыцці пасольства Судана прысутнічае асабіста кіраўнік суданскай дзяржавы. Гэта выключна важны выпадак для нашай практыкі, які з'яўляецца пацвярджэннем высокага ўзроўню сувязей і ўзаемаразумення паміж кіраўніцтвам нашых краін», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Вітаючы назначэнне пасла Судана ў Беларусі, ён пацвердзіў гатоўнасць беларускага боку аказваць усё неабходнае садзейнічанне рабоце пасольства. Пацвярджэннем таго, што для суданскага боку расчынены ўсе дзверы, з'яўляецца ўручэнне паслом адразу пасля прыбыцця ў Мінск даверчых грамат Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку, а таксама праведзеныя сустрэчы кіраўніка суданскай дыпмісіі са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, міністрам замежных спраў ды іншымі кіраўнікамі міністэрстваў і ведамстваў Беларусі.

Сяргей Румас запэўніў, што Судан застаецца для Беларусі важным партнёрам у Афрыцы. «У нас выдатныя адносіны на ўсіх узроўнях у розных сферах», — адзначыў кіраўнік беларускага ўрада.

Цэны

Што больш за ўсё патаннела і падаражэла ў лістападзе?

Сярод прадуктаў харчавання прыкметней за ўсё патаннелі цытрусавыя (на 9,08 працэнта), гарох і фасоля (на 2,86 працэнта), салёная і вэнджаная рыба, ласасёвая ікра (на 2,33 працэнта), сухафрукты (на 2,32 працэнта), паведамляе БелТА са спасылкай на даныя Белстата.

Лідары ў рэйтынгу тавараў, што падаражэлі, — свежыя агуркі (на 44,26 працэнта) і свежая белакачанная капуста (18,63 працэнта). Агародніна ў цэлым падаражэла на 15,36 працэнта. Стаў даражэйшы таксама вінаград і свежыя памідоры — на 14,32 працэнта і 12,38 працэнта адпаведна.

Абутак патаннеў на 3,31 працэнта, адзенне — на 0,08 працэнта. Цэны на мэблю знізіліся на 1,41 працэнта.

Што датычыцца паслуг, то ў сярэднім яны патаннелі на 0,04 працэнта. Самым прыкметным аказалася павелічэнне платы за аўтастаянку — на 3,92 працэнта.

Тытунёвыя вырабы сталі даражэйшыя на 0,61 працэнта, алкагольныя напоі — на 0,56 працэнта. Бензін і іншыя віды паліва выраслі ў цане на 1,81 працэнта.

Як паведамлялася, інфляцыя ў Беларусі ў лістападзе склала 0,6 працэнта.

Шматдзетныя мінчане палепшаць свае жыллёвыя ўмовы

У Мінску амаль 1,9 тысячы шматдзетных сем'яў змогуць пабудаваць жыллё ў 2019 годзе.

У праект інвестыцыйнай праграмы Мінска на 2019 год закладзены сродкі, якія пасадзейнічаюць будаўніцтву жылля для 1896 шматдзетных сем'яў. Аб гэтым паведаміў учора **старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Дзмітрый ГУРЫНЕНКА на аператыўнай нарадзе ў мэрыі, перадае карэспандэнт БелТА.**

«На аб'екты інжынерна-транспартнай інфраструктуры праектам інвестыцыйнай праграмы на 2019 год прадугледжана Br172 млн. Гэтыя сродкі дапамогуць выканаць гадавое заданне па забеспячэнні жыллём 1896 шматдзетных сем'яў. Цяпер камітэтам будаўніцтва рыхтуецца праект рашэння Мінгарвыканкама па ўводзе жылых дамоў у 2019 годзе», — сказаў Дзмітрый Гурыненка.

Асноўнай тэрыторыяй, якая асвойваецца для ўзвядзення жылля, ён назваў Фрунзенскі раён сталіцы. Тут плануецца забудоўваць участкі на месцы былой вёскі Сухарава, вайсковай часці ў Масюкоўшчыне. У Ленінскім раёне пачнецца актыўная фаза асваення мікрараёнаў Лошыца-5, Лошыца-6, Лошыца-8/1, Лошыца-9, у Заводскім — раён вуліц Шышкіна, Бабушкіна і інш.

Кава, Wi-Fi, свежыя газеты...

11 снежня ўвойдзе ў гісторыю беларускага друку. Насупраць мінскага Палаца спорту свае дзверы гасцінна адчыніў першы «разумны» павільён «Белсаюздрука». Так, колішнія кіёскі, якія не мянялі свой знешні выгляд дзесяцігоддзямі, пакрысе замяняліся звычайнымі павільёнамі, у якіх можна было не толькі выбраць, не спяшаючыся, свежы нумар патрэбнага выдання, але і замовіць кубачак кавы. Гандлёвы аб'ект, які адкрыўся сёння, на першы погляд не такі і вялікі — усяго 24 квадратныя метры па плошчы. Але змяшчае вельмі шмат цікавінак.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ і генеральны дырэктар РУП «Белсаюздрук» Ігар ДУДЗІЧ падчас адкрыцця новага павільёна.

Цяпер падчас выбару выдання або піцця кавы можна падзарадзіць смартфон. Калі трэба выйсці ў Сеціва — да паслуг наведвальнікаў безлімітны Wi-Fi. Запрацуе і імгненная сістэма ацэнкі прадаўцоў — так званы «лайкер». Ён дазволіць аператыўна рэагаваць на заўвагі і прапановы па рабоце як прадаўца, так і гандлёвай сеткі ў цэлым.

Паклапаціліся тут і пра хуткае абслугоўванне замежных гасцей, якія не валодаюць беларускай і рускай мовамі. Ім на дапамогу прыйдзе анлайн-перакладчык. Гэта асабліва важна, калі ўлічыць, што ўжо працяглы час у Беларусі дзейнічае кароткатэрміновы бязвізавы ўезд для грамадзян многіх краін свету, а таксама тое, што напярадзе — II Еўрапейскія гульні. Дарэчы, да гэтай спартыўнай падзеі ў павільёнах запрацуюць гарадскія навігатары, якія дапамогуць замежнікам арыентавацца ў Мінску.

Функцыянал «разумнага» павільёна на гэтым не заканчваецца. І ўжо акрэслены перспектывы яго пашырэння. З яго дапамогай можна будзе замовіць таксі, выклікаць экстранныя службы. А яшчэ — аплаціць камунальныя паслугі, заказаць білет на канцэрт і выбраць падарункавы сертыфікат буйных універмагаў.

Першы пакупнік.

— Узровень магчымасцяў такога павільёна значна перавышае тыя, якія ёсць у звычайных кіёскаў, — заўважыў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Мы ўжо задумваемся над тым, каб шырэй прадставіць у такіх гандлёвых кропках перыядычныя выданні. Па-першае, тут большая гандлёвая плошча. Па-другое, тут створаны добрыя ўмовы, каб пакупнік выбіраў патрэбныя яму выданні. Адначасова тут можна прадставіць больш за 250 найменняў перыёдыкі.

Аляксандр Карлюкевіч анансаваў, што да II Еўрапейскіх гульняў у Мінску адчыняць дзверы яшчэ некалькі дзясяткаў такіх павільёнаў «Белсаюздрука». Усе пляцоўкі для іх вызначаюцца сумесна з Мінгарвыканкамам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ЛЁД ХРУСЦІЦЬ ПАДМАНЛІВА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Адзін з братоў праваліўся непадалёк ад берага, здолеў выкараскацца сам і пабег дадому клікаць на дапамогу бацьку, дом стаяў зусім непадалёк ад ракі, — гаворыць **вядучы спецыяліст рэспубліканскага Савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Бацька палез ратаваць сына, і ледзь не патануў сам. Цячэнне ракі там даволі моцнае і яно панесла падлетка ад таго месца, дзе ён праваліўся.

Вадалазы шукалі яго цела амаль тыдзень. Справа ў тым, што з-за пераменлівага надвор'я ў вадзе ўтварыўся густы шарош — нетрывалыя кавалкі лёду. І вадалазам даводзілася разграбаць гэта ўсё ўручную ва ўмовах амаль нулявой бачнасці.

Яшчэ дзве трагедыі звязаны з рыбакамі. Па першым лёдзе рыба клюе, як вядома, вельмі добра. Непадалёк ад вёскі Мохаў Лоеўскага раёна мужчына паставіў сетку. А калі паплыў яе правяраць на лодцы, то перакуліўся і патануў. Яшчэ адзін рыбак праваліўся пад лёд у Мсціслаўскім раёне — на жаль, выбрацца назад ён таксама не паспеў.

А ў Жлобінскім раёне ў мінулую нядзелю ў меліярацыйны канал на хуткасці вылецеў легкавік. Ён перавярнуўся ў паветры і сваім дахам праламаў лёд. Калі ратавальнікі дасталі машыну з вады, то знайшлі ў ёй два целы — 37-гадовага кіроўцы і яго 59-гадовай маці.

— У першыя дні снежня на стаячых вадаёмах таўшчыня лёду дасягала 10 сантыметраў, — гаворыць Алег Баразна. — Як быццам бы і бяспечна — кропкай адліку лічыцца паказчык у сем сантыметраў, праўда, ён справядлівы тады, калі на лёд выходзіць адзін чалавек. Калі ж людзей некалькі, то лёд мусіць нарасці да 12 сантыметраў. Разам з тым маразам папярэднічала вельмі пераменлівае надвор'е. Адмоўныя тэмпературы ўначы змяняліся дадатнымі ўдзень. Лядок, які ледзь-ледзь сфарміраваўся, пачынае раставаць. Вады падбаўляюць дожджыкі і мокры снег. Наступнай ноччу яго зноў накрывае невялікім марозам. І вось так замест суцэльнай структуры покрыва ўтвараецца порыстая. Візуальна здаецца, што лёд набраў істотную таўшчыню. Хоць рэальны слой яго там складае ад сілы пару-тройку сантыметраў, якія, вядома, чалавека не ўтрымаюць. Менавіта таму выканкамы адзін за адным выдавалі напрыканцы лістапада забароны выхаду на лёд.

За які час фарміруецца бяспечнае покрыва?

— Гэта залежыць ад спецыфікі вадаёма. Ідэальныя ўмовы — стаячае возера, дзе адсутнічае цячэнне, няма ніякіх падземных крыніц і скідаў адпрацаванай цёплай вады. Кожны з пералічаных фактараў толькі запавольвае фарміраванне трывалага лёду. Ды і тое, трэба, каб на працягу як мінімум тыдня і начная, і дзённая тэмпературы былі ўвесь час адмоўнымі. Вось тады і сфарміруецца трывалы лёд. Ён мае белы або крыху блакітны колер. Уся астатняя гама — шэры, бледны, брудны — кажа пра тое, што покрыва разбураецца і вельмі небяспечнае.

Раней мы рэгістравалі шмат выпадкаў, як людзі правальваліся пад лёд, калі зразалі дарогу па замёрзлым вадаёме, каб не наразаць кіламетры да найбліжэйшага моста. Асабліва гэта датычылася сельскай мясцовасці. Апошнім часам гэтая праблема стаіць ужо не так востра.

Што рабіць, калі чалавек праваліўся пад лёд?

— Тэмпература падлёднай вады складае прыкладна 3—5 градусаў вышэй за нуль. У залежнасці ад масы цела і фізічнай падрыхтаванасці ў небаракі ёсць не больш за пяць хвілін да таго моманту, калі ён проста не здолее рухацца. Мышцы здранцвеюць, чалавек атрымае агульнае пераахалоджанне — і пойдзе ўніз. Дзіця, якое важыць менш за дарослага, замерзне куды хутчэй.

Менавіта таму перад выхадам на лёд трэба надзець ратавальную камізэльку. Нават калі вы праваліцеся пад лёд, то яна будзе падтрымліваць вас на паверхні вады, каб выбрацца. Таксама вельмі пажадана мець пры сабе спецыяльныя лядовыя штыры. Іх нават можна не шукаць у краме, а змайстраваць самому — увагнаць цвік у доўгую драўляную ручку. З дапамогай гэтага імправізаванага альпенштока можна падцягнуцца на паверхню лёду з палонкі. Таксама нядрэнна мець пры сабе лінь. Таму трэба выходзіць на лёд мінімум удваіх.

З чалавекам, які праваліўся, нельга ўваходзіць у прамы кантакт. Той, хто знаходзіцца ў палонцы, будзе чапляцца за любую магчымасць выратавацца дзякуючы інстынкту самазахавання. І з высокай доляй верагоднасці пацягне ратавальніка ўслед за сабой у палонку. Таму трэба працягнуць яму доўгі кій, вяроўку, падыдзе нават верхняя вопратка, скручаная ў жгут. Набліжацца да палонкі трэба толькі паўзком — калі чалавек праваліўся, значыць, лёд там крохкі і трэба змяншаць на яго ціск. Не саромцеся клікаць на дапамогу іншых людзей. Пасля таго як выцягнулі чалавека з вады — выклічце хуткую дапамогу і паспрабуйце яго сагрэць.

Фота БелТА.

Некалькі гадоў таму Таварыства ратавання на водах падрыхтавала законапраект. Ён прадугледжваў магчымасць штрафу за выхад на неакрэплы лёд. Але...

— Як мы ні спрабавалі даказаць, што гэта скіравана не на тое, каб пакараць, а каб папярэдзіць, — пакуль што закон так і застаецца ў выглядзе праекта, — гаворыць Алег Баразна. — Будзем спадзявацца, што гэтая справа ўсё-такі зрушыцца з мёртвага пункту...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

На слыху

ЧАМУ АБВАЛІЛАСЯ СТОЛЬ У «АРЭНА-СІЦІ»

У сталіцы ўжо праверана больш за палову аналагічных аб'ектаў

Адной з найбольш верагодных прычын абрушэння гіпсакардоннай падвеснай столі ў сталічным гандлёва-забаўляльным цэнтры «Арэна-Сіці» з'яўляецца парушэнне парадку правядзення будаўніча-мантажных работ.
Пра гэта ў эфіры тэлеканала СТБ паведаміў намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Андрэй БЕРТАШ.

«Адна з папярэдніх версій — парушэнне будаўніча-мантажных работ пры ўкладцы гэтай столі. Гэта адна з самых відавочных прычын», — сказаў прадстаўнік МНС у праграме «Вялікі горад».

Дакладную прычыну ўстанаўлівае Следчы камітэт, праводзіцца шэраг экспертыз. «Такіх выпадкаў у нас сапраўды за практыку не было, — адзначыў Андрэй Берташ. — Пасля таго як адбылося гэтае абрушэнне, дадзена даручэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях праверыць усе аб'екты. А ў Мінску іх з такімі ж столямі — 191, і ўжо больш за палову праверана».

Праверкі працягваюцца, іх скончаць праз два тыдні. «І пра гэта будзе паведамлена. Разгледзім усе гэтыя пытанні, якія выяўляюцца. Дадзены тэрміны на ліквідацыю, каб не паўтарыць падобнага», — адзначыў намеснік начальніка гарадскога ўпраўлення МНС.

> **Нагадаем, 12 лістапада ў гандлёва-забаўляльным цэнтры «Арэна-Сіці» абрынулася падвесная столь на плошчы 150 квадратных метраў. У выніку інцыдэнту пацярпелі дзве дзяўчыны. Пасля гэтага камісія па надзвычайных сітуацыях прыняла рашэнне праверыць усе аналагічныя столевыя канструкцыі ў гандлёвых аб'ектах Мінска.**

Работы ж па аднаўленні канструкцый столі ў «Арэна-Сіці» плануюць завяршыць да 25 снежня, і гандлёвы цэнтр будзе цалкам даступны для наведвальнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБВІНАВАЧАННЕ НЕ ПРАД'ЯЎЛЯЛАСЯ...

Завершана расследаванне крымінальнай справы аб забойстве і замаху на забойства.

Як паведамлялася раней, 17 жніўня ў вёсцы Баброві-чы Івацэвіцкага раёна мясцовы жыхар 1961 года нараджэння адкрыў стральбу з агнястрэльнай зброі па ўчастковых інспектарах міліцыі, якія праводзілі планавую праверку парадку захоўвання зброі. У выніку адзін з супрацоўнікаў быў смяротна паранены. Яго калегу былі прычыненыя цялесныя пашкоджанні, якія адносяцца да катэгорыі цяжкіх. Мужчына, які адкрыў агонь па ўчастковых, з 1987 года быў зарэгістраваны паляўнічым, меў дзеючы дазвол на захоўванне і нашэнне агнястрэльнай зброі.

Як паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці, праведзенай комплекснай судовай псіхолага-псіхіятрычнай экспертызай было ўстаноўлена, што абвінавачваны хварэў у момант здзяйснення інкрымінуемых яму дзеянняў і хварэе зараз на псіхічнае расстройства. У гэтай сувязі канчатковае абвінавачанне мужчыну не прад'яўлялася.

У перыяд расследавання крымінальнай справы ў сродках масавай інфармацыі мусіраваліся чуткі з нагоды быццам бы браканьерства міліцыянера. Гэтая інфармацыя была старанна праверана, аднак свайго аб'ектыўнага пацвярджэння не знайшла.

Крымінальная справа перададзена пракурору для накіравання ў суд, які разгледзіць пытанне аб прымяненні да абвінавачванага прымусовых мер бяспекі і лячэння.

Сяргей КУЛАКОЎ.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 10 (38)

«Гарачая» тэма

Ад чорнага да зялёнага

Пераход ад вугляроднага паліва да «зялёнай» эканомікі і аднаўляльных крыніц энергіі — адзіны шлях выратаваць планету, упэўнены эксперты.

З 2 па 14 снежня ў польскім горадзе Катавіцэ праходзіць 24-я сесія бакоў Рамачнай канвенцыі ААН па змяненні клімату (COP 24). У ёй прымаюць удзел дэлегаты са 193 краін, у тым ліку сусветныя лідары, эксперты, актывісты, наватары, бізнесмены і прадстаўнікі грамадскасці. На чале беларускай дэлегацыі — міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык.

Галоўная задача ўдзельнікаў канферэнцыі — выпрацаваць канкрэтныя шляхі выканання мэт, якія былі вызначаны ў Парыжскім пагадненні па клімаце, і ў першую чаргу — скарачэння выкідаў парніковых газаў.

Напярэдадні канферэнцыі **Генеральны сакратар ААН Антоніу ГУТЭРЫШ** адзначыў, што тэмпы змены клімату апярэджваюць прагнозы вучоных, а дзеянні ў адказ адстаюць ад тэмпаў глабальнага пацяплення. Каб выканаць пастаўленую мэту і не дапусціць павышэння тэмпературы да канца стагоддзя больш чым на 1,5-2 °С, неабходна да 2040 года скараціць выкіды CO_2 на 40 %, а да 2050-га дасягнуць так званага нулявога балансу. Для гэтага ад паловы да дзвюх трацей патрэбнасцяў чалавецтва ў энергіі да сярэдзіны стагоддзя павінны пакрывацца за кошт аднаўляльных крыніц, а доля выкапнёвага паліва, адпаведна, зніжацца.

Ад наступстваў змены клімату не застрахаваны ніхто — ні бедныя, ні багатыя дзяржавы. Таму трэба працаваць над рашэннем гэтай праблемы разам, падкрэсліў Антоніу Гутэрыш.

Беларусь сёння падтрымлівае пераход ад абмеркавання пытанняў да прыняцця канкрэтных мер па дасягненні канчатковай мэты Рамачнай канвенцыі ААН па змяненні клімату. Так, наша краіна без усялякіх умоў узяла на сябе абавязацельствы забяспечыць да 2030 года скарачэнне выкідаў парніковых газаў не менш чым на 28 % да ўзроўню 1990 года. Рэалізуецца праграма мер па змякчэнні наступстваў змены клімату да 2020 года, і распрацаваны план мерапрыемстваў па рэалізацыі Парыжскага пагаднення, дзе вызначаны меры па скарачэнні выкідаў і павелічэнні абсорбцыі лясамі і водна-балотнымі ўгоддзямі як асноўнымі паглынальнікамі парніковых газаў у краіне.

Фота news.un.org

Генеральны сакратар ААН Антоніу ГУТЭРЫШ падкрэсліў, што, каб стрымаць рост тэмпературы на планеце, трэба да 2040 года скараціць выкіды CO_2 на 40 %.

— Мы разглядаем «зялёную» эканоміку, нізкавугляроднае ўстойлівае развіццё як стратэгічны вектар, — адзначылі ў Мінпрыроды. — І гатовыя зрабіць больш у такіх галінах, як энергетыка, транспарт, прамысловасць, будаўніцтва і абыходжанне з адходамі. Для нас таксама важная падтрымка па адаптацыі да змены клімату такіх уразлівых сектараў, як лясная і сельская гаспадарка.

У прыродаахоўным ведамстве падкрэслілі, што адна з істотных умоў поспеху Парыжскага пагаднення і дасягнення ўзгодненай агульнай мэты — стварэнне справядлівых і прымальных крытэрыяў доступу да міжнародных кліматычных фондаў. Абмежаванне ці пазбаўленне такой магчымасці краін з сярэднім узроўнем даходу, з пераходнай эканомікай перашкаджае паўнавартаснай рэалізацыі існуючага ў іх патэнцыялу на карысць агульнай справе па прадухіленні змены клімату.

Вераніка КОЛАСАВА.

Сёння міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык выступіць на кліматычнай канферэнцыі з дакладам, дзе выкажа пазіцыю Беларусі па гэтым пытанні, а таксама падчас канферэнцыі правядзе некалькі сустрэч з міністрамі прыродаахоўных ведамстваў іншых краін.

Каштоўныя рэсурсы

Вады — хоць заліся?

Як праект ВІЕС дапамагае захаваць беларускія рэкі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Захаванне водных рэсурсаў — адзін з галоўных прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі нашай краіны.

Да 2030 года нашы вадаёмы адаптуюць да змены клімату і прывядуць у адпаведнасць шостай мэце ўстойлівага развіцця: для гэтага распрацавана новая водная стратэгія Беларусі ў рамках міжнароднага праекта «Водная ініцыятыва Еўрапейскага савета плюс» (ВІЕС), якая фінансуецца ЕС.

Беларусь — сінявокая, краіна прыгожых рэк і азёр — гэта сёння ведае кожны школьнік. Без вады чалавек не можа пражыць больш за тры дні, таму не дзіўна, што мець водныя рэсурсы раўняецца эканамічнай і сацыяльнай выгадзе.

Між тым існуе шмат фактараў, якія пагражаюць якасці вады і, як вынік, здароўю насельніцтва — прамысловая і сельскагаспадарчая дзейнасць, змена клімату і г. д. Менавіта па гэтай прычыне водная бяспека сёння — адзін з галоўных прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі нашай краіны.

Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў (ЦНДІКВВР) Сняжана ДУБЯНОК адзначае, што пад воднай бяспекай маецца на ўвазе надзейнае забеспячэнне насельніцтва і галін эканомікі воднымі рэсурсамі ў дастатковай колькасці і ў прымальнай якасці пры адпаведнай фінансавай даступнасці, ахова насельніцтва і галін эканомікі ад негатыўнага ўздзеяння вод, забеспячэнне добрага экалагічнага стану і статусу водных аб'ектаў.

— Усе гэтыя прынцыпы прапісаны і ў дзейнай водная стратэгіі Беларусі да 2020 года. У новай жа версіі (да 2030 года) яны будуць дапрацаваны ў адпаведнасці з шостай мэтай устойлівага развіцця і з асаблівасцямі змены клімату, — падкрэсліла спецыяліст.

Да таго ж на тэрыторыі Беларусі працякае сёння сем буйных рэк працягласцю больш за 500 км, шэсць з якіх (акрамя Бярэзіны) з'яўляюцца трансгранічнымі, г. зн. праходзяць па тэрыторыі дзвюх і больш краін. Таму, па словах Сняжаны Дубянок, яшчэ адна важная частка новай стратэгіі — развіццё міжнароднага трансгранічнага супрацоўніцтва.

— Новая стратэгія разглядае пытанні прыцягнення навукоўцаў і грамадскасці да вырашэння водных праблем, а таксама асветы насельніцтва, — расказала эксперт. — Рэалізоўваць жа яе мы плануем у два этапы.

Каардынаваць эфектыўнасць рэалізацыі праекта будзе Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

— У гэтым годзе ўжо распачалася вялікая праца па абследаванні патэнцыялу лабараторый, якія займаюцца маніторынгам водных аб'ектаў, складзены пералік абсталявання, што неабходна паставіць у Беларусь у рамках праекта. Налета мы плануем гэты пералік дэталізаваць і правесці тэндар на яго ўстаноўку, а таксама навучэнне персаналу, — адзначыла **начальнік аддзела выкарыстання і аховы водных рэсурсаў Мінпрыроды Таццяна СЛІЖ.**

Акрамя гэтага, адзначыла спецыяліст, прадугледжана рэалізацыя пілотных праектаў, асноўныя мерапрыемствы якіх будуць праходзіць у басейнах рэк Дняпро і Прыпяць.

Кацярына ЦІТОВА.

Адукацыя

Экалагічныя праекты сталічнай гімназіі № 19,

ці Паўвекавы вопыт навучання і выхавання на карысць прыроды

На працягу 50 гадоў педагагічны калектыў гімназіі № 19 г. Мінска працуе над развіццём экалагічнай адукацыі вучняў. Як увесь гэты час удаецца падтрымліваць высокі «зялёны» статус установы, расказала намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Наталля СТАХНО.

— Сёння наша гімназія з'яўляецца Рэсурсным цэнтрам комплекснай падтрымкі практык адукацыі для ўстойлівага развіцця, што дае ёй магчымасць транслюваць экалагічныя веды ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў як у Беларусі, так і за яе межамі, — гаворыць Наталля Стахно. — Гімназія супрацоўнічае са многімі школамі і ВНУ нашай краіны, а таксама з установамі адукацыі Расійскай Федэрацыі, Літвы, Азербайджана, Нідэрландаў, Японіі.

Гімназія № 19 — гэта вучэбна-метадычны комплекс, які ўключае ў сябе эксперыментальныя лабараторыі «Зімовы сад» і «Прыродны сад», карэкцыйна-педагагічны, вучэбна-кансультацыйны, інфармацыйна-аналітычныя цэнтры, цэнтр дзіцячай мастацкай творчасці і экспазіцыю мінералаў і горных парод.

Унікальная эксперыментальная лабараторыя «Зімовы сад» адкрылася ў 1996 годзе. Калекцыя саду складаецца з 45 сямействаў раслін, прадстаўленых 250 відамі. Таксама тут можна паназіраць і за прадстаўнікамі жывёльнага свету — рыбамі, чарапахамі, шпорцавай жабай, кубінскім ракам, афрыканскім слімаком, мангольскай пясчанкай. Унікальнасць калекцыі Зімовага саду пацверджана Цэнтральным батанічным садам НАН Беларусі.

— Самы «зялёны» наш праект — «Планета без адходаў». Ён ужо даўно выйшаў за межы гімназіі, — лічыць Наталля Віктараўна. — У рамках гэтага праекта рэалізуюцца акцыі «Дадзім адходам другі шанц», «Другое жыццё пластыкавай накрыўкі», «Школа энергазберажэння для пажылых людзей», «Чыстая энергія, або Аперацыя «Утылізацыя», «Гімназія — зона, свабодная ад пластыку». У выніку рэалізацыі гэтага праекта была створана сістэма паасобнага збору адходаў.

У 2018 годзе вучні прымалі ўдзел у конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend і прайшлі ў чвэрцьфінал.

Вопыт працы педагагічнага калектыву гімназіі № 19 г. Мінска па рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця і фарміраванні экалагічнай культуры як неад'емнай яе часткі быў прадстаўлены ўстановай у рамках трэцяга Агляду выніковасці экалагічнай дзейнасці для экспертаў Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН і высока ацэнены ў нашай краіне і за мяжой.

Па словах намесніка дырэктара, створаная пры падтрымцы Мінпрыроды, Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя інфраструктура гімназіі стала пляцоўкай для навукова-даследчай і праектнай дзейнасці, важнай матэрыяльна-тэхнічнай умовай забеспячэння дапрофільнай і профільнай падрыхтоўкі вучняў. Яна спрыяе эфектыўнаму фарміраванню экалагічнага светапогляду і экадружнасці не толькі ва ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу, але і ў мясцовай супольнасці.

Настасся АЛЯКСЕЕВА.

Гісторыя ўстановы адукацыі пачалася ў 1968 годзе з адкрыцця сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 113 г. Мінска. У 1997 годзе яна пачала працаваць «з экалагічным ухілам», а яшчэ праз восем гадоў была перайменавана ў Экалагічную гімназію № 19 г. Мінска. З 2008 года афіцыйная яе назва — дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія № 19 г. Мінска».

На варце прыроды

Сяргей СЕРАПІН:

«Мы даўно адышлі ад дробных прыдзірак»

Дзякуючы ўзаемадзеянню Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя з гарадскімі службамі ўсе нязначныя пытанні па добраўпарадкаванні вырашаюцца ў рабочым парадку.

Працягваем знаёміць чытачоў з работнікамі сістэмы Мінпрыроды, чые імёны занесены на ведамасную Дошку гонару. Сёння наш суразмоўнік — **начальнік аддзела аператыўнага кантролю па Маскоўскім, Ленінскім, Цэнтральным раёнах Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей СЕРАПІН.**

— Шмат жыхароў сталіцы выказваюць занепакоенасць у сувязі з тым, што з двароў зніклі кантэйнеры для шкла і паперы. Што адбываецца?

— Гэта часовыя цяжкасці. Усе старыя кантэйнеры для паперы, пластыку і шкла хутка заменяць на сучасныя, больш надзейныя, добра абароненыя ад знешніх фактараў. Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя фінансава ўдзельнічае ў гэтым праекце. Таксама цяпер сумесна з раённымі службамі ЖКГ прапрацоўваем пытанне аб устаноўцы ў Мінску заглыбленых кантэйнераў для цвёрдых бытавых адходаў. Яны значна зручнейшыя, больш ёмістыя і эстэтычныя, чым тыя, што выкарыстоўваюцца цяпер.

— Што можна сказаць пра экалагічнае становішча на вашай падведамаснай тэрыторыі?

— Ленінскі і Цэнтральны раёны — самыя экалагічна чыстыя з зоны маёй адказнасці. Вы скажаце, што, напрыклад, у Цэнтральным раёне размешчаны завод «Атлант». Адкажу, што гэта прадпрыемства, якое надзвычай адказна ставіцца да пытанняў экалагічнай бяспекі і па праве занесена на гарадскую Дошку гонару. Наш самы вялікі клопат у гэтых раёнах — рака Свіслач. Раз на месяц робім абыход на прадмет выканання патрабаванняў водаахоўнага заканадаўства.

Маскоўскі раён больш складаны, у ім шмат прамысловых прадпрыемстваў. Насельніцтва асабліва турбуюць шкодныя выкіды, і таму гэтае пытанне заўсёды ў нас на кантролі. Ды і самі прадпрыемствы праяўляюць свядомасць, выдаткоўваюць сродкі на абнаўленне газаачышчальных сістэм. У сваёй інспектарскай дзейнасці мы даўно адышлі ад дробных прыдзірак. Наладжана ўзаемадзеянне з гарадскімі службамі, усе нязначныя пытанні вырашаюцца на месцы.

— Ва ўсіх трох раёнах ёсць прыватны сектар. На першы погляд, гэта ў асноўным дыхтоўныя дамы, дагледжаныя ўчасткі. А што выяўляецца падчас абследавання жылых тэрыторый?

— У прыватным сектары пакуль яшчэ застаюцца асобныя праблемы з санітарным станам участкаў, нясвоечасовым вывазам адходаў і іх складзіраваннем у несанкцыянаваных месцах. Так ці інакш, гэта вырашальная праблема: дзесьці хапае растлумачальнай працы, дзесьці просім мясцовыя службы ЖКГ перагледзець графік вывазу смецця. У прыватным сектары практычна нідзе няма стацыянарных пляцовак для збору адходаў. Таму людзі выкладваюць пакеты па ходзе руху смеццявоза. Злосных парушальнікаў няшмат, але кожны з іх наносіць каласальную шкоду прыродзе. Напрыклад, падчас рэйду ў раёне старой прыватнай забудовы мы выявілі майстэрскі замаскіраваную трубу антысептыку, якая выходзіла проста ў Свіслач. Вядома, склалі пратакол, паводле рашэння суда на гаспадара дома быў накладзены штраф. У гэтай гісторыі мяне да бясконцасці здзіўляе эгаізм. Чалавек не думае пра суседзяў, дык хаця б падумаў пра тое, што на беразе забруджанай ракі будуць жыць яго дзеці і ўнукі.

— Якія яшчэ пытанні ў полі зроку аддзела аператыўнага кантролю?

— Вядзецца сістэмны кантроль за выкананнем заканадаўства ў галіне абыходжання з адходамі, у тым ліку за недапушчэннем іх захавання на палігонах. Акрамя абследавання жылых тэрыторый выяўляем несанкцыянаваныя звалкі адходаў на тэрыторыі агульнага доступу, у прыдарожных палосах, месцах адпачынку. На кантролі ў нас таксама пытанні ўладкавання месцаў збору адходаў з тэрыторыі могілак, прывядзенне ў належны стан мемарыяльных комплексаў. Супрацоўнікі камітэта прымалі ўдзел у суботніку на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Малы Трасцянец» у межах кампаніі «Уладкуем малую радзіму!».

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота аўтара.

Падводзім вынікі

Зорны час для крэатыўных

Часопіс «Родная прырода» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сумесна з Міністэрствам адукацыі падвялі вынікі рэспубліканскага экалагічнага конкурсу ідэй «Прырода малой радзімы».

На рэдакцыйную пошту прыйшло больш за 80 работ ад устаноў адукацыі з розных куткоў Беларусі. Забруджванне паветра, глеб і водных рэсурсаў, праблема адходаў, барацьба з інвазійнымі раслінамі і жывёламі, азеляненне і добраўпарадкаванне населеных пунктаў — тэмы, па якіх працавалі ўдзельнікі конкурсу, былі розныя. Аб'яднала іх любоў да роднай зямлі і імкненне агульнымі намаганнямі зрабіць яе экалагічна чыстай, прывабнай для турыстаў і ўтульнай для мясцовых жыхароў.

Хто ж стаў пераможцам?
Сярод калектыўных работ тройка лідараў наступная:

1-е месца — «Распрацоўка 3D-атласа «Развіццё экалагічнага турызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях Гродзенскай вобласці», аўтары — Ксенія Сідаровіч і Ілья Гульнік, Едкаўская сярэдняя школа, Лідскі раён Гродзенскай вобласці;

2-е месца — «Папера з трыснягу», аўтары — удзельнікі навуковага таварыства вучняў па хіміі, сярэдняя школа № 2 г. п. Зэльва, Гродзенская вобласць;

3-е месца — экалагічны праект «100 %», аўтары — удзельнікі клуба ЮНЕСКА «Шок», сярэдняя школа № 9 г. Брэста.

Сярод індывідуальных работ перамаглі:

1-е месца — «Аўтаномны вулічны ліхтар для горада Брэста з гарызантальным ветрагенератарам і сонечнымі панэлямі», аўтар — Цімафей Авярчук, сярэдняя школа № 13 г. Брэста імя В. І. Хована;

2-е месца — экалагічная акцыя «Уцёкі з агародчыка», аўтар — Іна Бука, гімназія г. Буда-Кашалёва, Гомельская вобласць;

3-е месца — даследчая работа «Тайны смеццевага вядра», аўтар — Ганна Заяц, сярэдняя школа № 1 г. Петрыкава, Гомельская вобласць.

Мы сардэчна віншуем аўтараў работ з перамогай і запрашаем у Выдавецкі дом «Звязда» па падарунак. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па нумары 8 (017) 263-84-61.

Работы пераможцаў рэспубліканскага конкурсу ідэй «Прырода малой радзімы» можна прачытаць на старонцы часопіса «Родная прырода» http://zviazda.by/be/edition/rodnaya-pryroda, а таксама ў снежаньскім нумары выдання.

Спадзяёмся, ідэі, выказаныя пераможцамі, рэалізуюцца не толькі на іх малой радзіме, але і ў іншых рэгіёнах Беларусі, стануць перадумовай для паляпшэння экалагічнай сітуацыі ў краіне.

Вераніка КОЛАСАВА.

Чысты горад

НА ВАГУ І НА РАЗЛІЎ

У Мінску запрацавала «безадходная» карта

Грэчка на вагу і бытавая хімія ў сваю бутэльку — у сталіцы па ініцыятыве Цэнтра экалагічных рашэнняў з'явілася Zero waste карта, якая дапаможа мінчанам утвараць менш адходаў. Паўдзельнічаць у яе распрацоўцы можа кожны ахвотны!

На безадходнай карце сабраны месцы, дзе можна купіць тавары без упакоўкі, а таксама шматразовыя альтэрнатывы аднаразовым рэчам (напрыклад, мяшочкі з тканіны для садавіны і агародніны альбо драўляныя вушныя палачкі замест пластыкавых). Пры гэтым чакаецца, што заносіць такія месцы на карту будуць звычайныя людзі — такім чынам, ужо сёння любы чалавек можа зрабіць важны крок на шляху да экалагічна дружалюбнага ладу жыцця.

— Ідэя праекта ляжала на паверхні, — расказала каардынатар Zero waste карты, супрацоўніца Цэнтра экалагічных рашэнняў Таццяна Кузняцова. — Нядаўна ў нас у «тэлеграме» з'явіўся чат, дзе кожны можа нешта спытаць альбо нечым падзяліцца. І вось самае папулярнае пытанне датычылася якраз безадходных пакупак. Такія запыты пастаянна паўтараліся, і мы вырашылі: а чаму б не скласці карту, дзе ўсё будзе структуравана і зразумела.

Карыстацца Zero waste картай няцяжка: там ёсць некалькі слаёў і маркёраў, якія дапамогуць зарыентавацца. Цяпер вы можаце знайсці альбо занесці на рэсурс наступныя катэгорыі: бакалею (макароны, крупы, муку і г. д.), розныя прысмакі (вафлі, зефір, цукеркі і г. д.), бытавую хімію, касметыку — зразумела, усё гэта павінна прадавацца без упакоўкі, нават папяровай. Таксама на карце ёсць катэгорыі тавараў і месцаў, якія дапамогуць замяніць розныя рэчы на больш экалагічны варыянт. Гэта, напрыклад, экатавары (шматразовыя трубачкі), ежа на вынас альбо адзенне (сэканд-хэнды ці дабрачынныя крамы). Яшчэ на карце вы можаце ўбачыць нетыповую катэгорыю пад назвай «Пакет free магазіны» — сюды арганізатары прапануюць заносіць магазіны, якія без праблем прадаюць тавары ў сваю ўпакоўку.

— На жаль, сёння некаторыя пакупнікі сутыкаюцца з такімі сітуацыямі, калі ім не хочуць адпускаць вагавую прадукцыю ў сваю тару. У асноўным прадаўцы спасылаюцца на заканадаўства і санітарна-гігіенічныя нормы, але мы высветлілі, што нідзе няма прамой забароны на выкарыстанне свайго пакета альбо кантэйнера пры ўмове, што яны чыстыя, вядома. У такіх выпадках



мы прапануем пытаць у супрацоўнікаў канкрэтны пункт закона і што там напісана, — падкрэсліла Таццяна.

Але бываюць выпадкі, калі выкарыстоўваць толькі аднаразовую тару — палітыка магазіна, тут ужо трэба рэкамендаваць, каб яна была перагледжана.

— У адзін са сталічных магазінаў мы звярнуліся з такой просьбай і атрымалі пісьмовы адказ, дзе начальства пацвердзіла — у іх можна пакласці прадукты ў сваю тару. Форму звароту мы размясцілі на нашым сайце, — адзначыла спецыяліст.

Каб Zero waste карта была карыснай і сапраўды безадходнай, каардынатары праекта рэкамендуюць прытрымлівацца некаторых правіл. Напрыклад, не заносіць на яе прадукты, якія прадаюцца без упакоўкі ў кожным магазіне (садавіну, агародніну), альбо шматразовыя тавары, якія вельмі распаўсюджаны (тэрмакубкі, экаторбы і г. д.), а таксама экалагічную касметыку і хімію нават з добрым складам, але ў аднаразовай тары. Што датычыцца сэканд-хэндаў, то лепш пісаць, чым ён адрозніваецца ад іншых.

— Сёння экалагічна свядомых людзей становіцца ўсё больш, — падкрэсліла Таццяна Кузняцова. — Менавіта дзякуючы іх запытам і з'явілася наша карта. Магчыма, шмат каго натхніла Беа Джонсан (zero waste актывістка), якая не так даўно прыязджала і ў Беларусь.

Кацярына ЦІТОВА.
Шукайце Zero waste карту па спасылцы https://ecoidea.by/ru/zerowaste.

Фота Івана КУПРЭВІЧА.

Жыллёвая палітыка

НОВЫЯ ЛЬГОТЫ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ

Каму пабудаваць кватэру стане прасцей

У нашай краіне прыняты дадатковыя меры па ўзмацненні дзяржаўнай падтрымкі дзяцей-сірот і шматдзетных сем'яў пры будаўніцтве жылля. На гэта накіраваны ўказы № 474 «Аб дзяржаўнай падтрымцы пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў» і № 473 «Аб долевым будаўніцтве», якія лідар дзяржавы падпісаў 10 снежня.

Павялічаныя субсідыі і пазачарговы парадак

Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр АЎРАМЕНКА ў прэс-цэнтры БелТА падрабязна расказаў аб мерах, прадугледжаных указам № 474.

Нормы гэтага дакумента дапаўняюць дзеючыя ўказы № 13 і № 240, якія прадугледжваюць выдзяленне дзяржпадтрымкі грамадзянам пры жыллёвым будаўніцтве. «Гэтыя ўказы з часам даказалі сваю правільнасць і актуальнасць, але... Мы прааналізавалі практыку прымянення механізма субсідавання, каб зняць усе шурпатасці. Напрыклад, дзецям-сіротам і прыраўнаваным да іх асобам з улікам іх асаблівага статусу павялічаны памер субсідыі на пагашэнне асноўнага доўгу па крэдытах, што выдаюцца на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылля, з 35 % да 50 % ад сумы асноўнага доўгу. Сапраўды, гэтым людзям часта не хапала субсідый у ранейшым памеры.

У якасці дадатковых мер сацыяльнай абароны шматдзетных сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, ім дадзена права на будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай у першачарговым парадку па аналогіі са шматдзетнымі сем'ямі, якія маюць чацвярых і больш непаўналетніх. «Ад хуткасці атрымання жылля часта залежаць здароўе і жыццё маленькага інваліда», — растлумачыў новаўвядзенне прадстаўнік міністэрства.

Акрамя таго, грамадзянам, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, даецца права на атрыманне субсідыі на пагашэнне 50 % асноўнага доўгу па камерцыйных крэдытах.

Можна звяртацца паўторна

За шматдзетнымі сем'ямі, якія атрымалі дзяржаўную падтрымку, замацоўваецца права на яе паўторнае атрыманне. Гэта дзейнічае ў тым выпадку, калі павелічэнне складу сем'яў звязана з нараджэннем дзяцей пасля паляпшэння жыллёвых умоў, а яны раней пабудавалі дом ці кватэру плошчай менш за 15 квадратных метраў на чалавека.

Указ таксама ўдакладняе, што да членаў сем'яў — атрымальнікаў ільготных крэдытаў, аднаразовых субсідый адносяцца цяпер і іх дзеці ва ўзросце да 23 гадоў, якія праходзяць альтэрнатыўную службу, — па аналогіі з дзецьмі, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу па прызыве.

Указ № 240 аб адрасным субсідаванні ў жыллёвым будаўніцтве ўступіў у сілу 6 жніўня 2017 года. Дзяржаўныя субсідыі выдзяляюцца на выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам на будаўніцтва жылля, атрыманым грамадзянамі ў любым камерцыйным банку, а шматдзетным і маладым сем'ям і дзецям-сіротам — таксама на пагашэнне часткі асноўнага доўгу па такіх крэдытах. Атрымальнікамі субсідый могуць быць усе грамадзяне, якія маюць права на дзяржаўную падтрымку ў адпаведнасці з указам № 13 ад 6 студзеня 2012 года.

Пацярпелым ад ЧАЭС і не толькі

Згодна з прынятым дакументам, для малазабяспечаных грамадзян, якія жывуць і працуюць у населеных пунктах на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці і будуюць там жыллё, памер субсідыі на выплату часткі працэнтаў па камерцыйных крэдытах павялічваецца на чатыры працэнтныя пункты.

«Для гэтай катэгорыі грамадзян пры будаўніцтве жылля за кошт уласных сродкаў сям'і плацяжы знізяцца на 129,3 рубля і складуць 194,5 рубля ў месяц. Гэта значыць, калі раней працэнтная стаўка па крэдыце была ўмоўна роўная 5 % гадавых, то цяпер яна будзе ўсяго 1 %», — паведаміў н**ачальнік аддзела жыллёвай палітыкі камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр МАРФОНАЎ.** Ён адзначыў, што гэтыя новаўвядзенні прымаюцца з мэтай зніжэння крэдытнай нагрузкі на жыхароў рэгіёна, прыцягнення і замацавання ў ім маладых і высокакваліфікаваных спецыялістаў. За студзень — кастрычнік сёлета ў гэтым рэгіёне пабудавана 16,4 тысячы квадратных метраў жылля, у тым ліку з дзяржпадтрымкай больш за пяць тысяч «квадратаў».

У кагосьці льготу забяруць

Таксама ўказ № 474 закрануў грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы, але плануюць абзавесціся ўласнай кватэрай з дзяржпадтрымкай. З 1 сакавіка 2019 года гэта катэгорыя будзе мець абмежаванае права на атрыманне дзяржпадтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылля. Такая дапамога не будзе аказвацца сем'ям, усе працаздольныя члены якіх не занятыя ў эканоміцы. Пры гэтым яны могуць паўторна звярнуцца па яе, калі адпалі падставы для аднясення іх да не занятых у эканоміцы.

У рублях — і ніяк інакш

Указ № 473 «Аб долевым будаўніцтве» прыняты ў мэтах удасканалення праваадносін бакоў пры долевым будаўніцтве аб'ектаў у Беларусі і адмяняе дзеянне ўказа ад 6 чэрвеня 2013 года № 263.

Дакументам уводзіцца шэраг новых нормаў. У прыватнасці, шматдзетным сем'ям даецца пераважнае права на атрыманне накіравання на долевае будаўніцтва аднакватэрных жылых дамоў або жылых памяшканняў у блакіраваных жылых дамах.

Цана ў дагаворы аб долевым будаўніцтве будзе фарміравацца толькі ў беларускіх рублях. «Больш ніякай прывязкі да долара не дапускаецца. Гэта зроблена з мэтай выканання палітыкі дэдаларызацыі і таму, што зарплату мы ўсе атрымліваем у рублях», — заўважыў Аляксандр Аўраменка.

Цяпер, калі долевае жыллё будуецца за кошт бюджэтных сродкаў, то яно ўзводзіцца без прыбытку забудоўшчыка. Такую норму ўводзяць з прычыны эканоміі бюджэтных сродкаў.

Правы дольшчыка — вышэй за ўсё

Начальнік аддзела рэгулявання жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Таццяна ЗАТУРЭНСКАЯ адзначыла, што новым указам аб долевым будаўніцтве прадугледжаны дадатковыя меры абароны правоў дольшчыкаў ад нядобрасумленных забудоўшчыкаў.

Ажыццяўляецца гэта наступным чынам. Уводзіцца новы парадак залічэння грашовых сродкаў дольшчыкаў. Для дадатковай абароны ад нядобрасумленных забудоўшчыкаў на спецрахунак будуць залічвацца сродкі не толькі на будаўніцтва аб'екта, але і на выдаткі забудоўшчыка, што не ўключаны ў зводны каштарыс будаўніцтва, але адносяцца на гэты кошт. Гэта, напрыклад, выдаткі на рэгістрацыю дома, працэнты па крэдытах, узятых на праектныя работы, і іншыя.

Да прыняцця ўказа № 473 гэтыя выдаткі накіроўваліся на разліковы рахунак забудоўшчыка, куды ішоў таксама яго прыбытак.

«Неабходнасць увядзення гэтай нормы тлумачыцца практыкай. Нямала было выпадкаў, калі забудоўшчык сыходзіў у банкруцтва і «вычышчаў» разліковы рахунак, на якім былі грошы людзей», — адзначыла Таццяна Затурэнская.

У дакуменце аб долевым будаўніцтве прапісана яшчэ адно новаўвядзенне: грашовыя сродкі ад продажу кватэр, пабудаваных за кошт уласных сродкаў дзяржаўных прадпрыемстваў, будуць пералічвацца на бягучыя рахункі гэтых прадпрыемстваў, а не ў бюджэт, як гэта было раней.

З улікам практыкі прымянення ўказа № 263 удакладняюцца істотныя ўмовы дагавораў долевага будаўніцтва, парадак апублікавання праектнай дэкларацыі, прыцягнення грашовых сродкаў дольшчыкаў, функцыянавання спецыяльных рахункаў, а таксама парадак фарміравання і змены кошту дагавора.

Савету Міністраў даручана ў трохмесячны тэрмін вызначыць парадак заключэння, выканання і скасавання дагавора долевага будаўніцтва і зацвердзіць тыпавую форму такой дамовы. Дзеянне ўказа не распаўсюдзіцца на аб'екты, дазвольная дакументацыя на будаўніцтва якіх дадзена да ўступлення ў сілу гэтага дакумента. Асноўныя палажэнні ўказа ўступаюць у дзеянне праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Сяргей КУРКАЧ.

Працяг тэмы

ЯШЧЭ РАЗ — ПРА ІНФРАСТРУКТУРУ

Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва растлумачыла механізм пакрыцця затрат на інфраструктуру пры будаўніцтве індывідуальных дамоў.

Калі інфраструктура ўжо ёсць і ўчастак быў куплены пасля ўступлення ў сілу пастановы Савета Міністраў нумар 298, гэта значыць, пасля 1 красавіка 2014 года, паведамляе БелТА, то плаціць за яе трэба, але толькі ў тым выпадку, калі гэта сума была загадзя ўлічана ў кадастравым кошце ўчастка. На аўкцыёне павінна быць выстаўлена агульная лічба, адпаведна, грамадзянін плаціць адзін раз. Калі мясцовыя ўлады загадзя гэтыя затраты не ацанілі і не заклалі ў кошт, заднім чыслом патрабаваць з грамадзяніна якую-небудзь суму пасля аўкцыёну незаконна.

Пры адначасовым будаўніцтве інфраструктуры і аб'екта на ўчастку пакрываць затраты давядзецца, але грамадзянін павінен ведаць аб гэтай суме яшчэ ў час аўкцыёну.

Рэзанансным стаў выпадак з індывідуальнай забудовай участка ў Стаўбцоўскім раёне, дзе пры існуючай інфраструктуры ўладальніку ўчастка і пабудаванага ўжо на ім дома выставілі рахунак на пакрыццё затрат на інфраструктуру пасля аўкцыёну. У дазволе на будаўніцтва дома не была пазначана неабходнасць пакрыцця затрат.

Намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ падкрэсліў, што мясцовыя органы ўлады ў гэтым выпадку не маюць рацыі. «На аўкцыён выстаўляецца толькі адна лічба — рыначны кошт зямельнага ўчастка. Я думаю, што была дапушчана памылка мясцовым органам кіравання Стаўбцоўскага раёна. Яна заключалася ў тым, што пры наяўнасці інфраструктуры механічна выставілі яшчэ дадаткова кошт, спасылаючыся на дзеянне пастановы. Гэта памылковая пазіцыя, думаю, што яны прызнаюць гэтую памылку і папросяць прабачэння», — сказаў ён.

З усімі... Сам-насам

«БЕЗ ЯЕ ЦЯПЕР НІЯК!»

«Ты адно запомні, браце, са «Звяздой» цяплей у хаце!» — прызнаў гэта нехта з чытачоў. А вось хто канкрэтна...

Праўду кажуць: дрэнны аловак лепшы, чым добрая памяць, — трэ было запісаць, хаця б таму, што ў пошце па зразумелых прычынах не так ужо і шмат мудрых, крылатых слоў, не так шмат, на жаль, кампліментаў. Ды і саміх лістоў...

Аднак на адрас «Звязды» яны паранейшаму прыходзяць (то зусім кароткія — літаральна ў некалькі сказаў, то куды даўжэйшыя). Не кожны, карацей, змесціш у адмысловай рубрыцы «Я зноў выбіраю «Звязду», а таму...

«Дапускаю, што ёсць на свеце людзі, якім дастаткова пасядзець у інтэрнэце ды паглядзець тэлевізар, — піша **спадарыня Ніна Кандрашонак з Петрыкава.** *— Але ж калі чалавеку пашчасціць, і ён выбера для сябе добрую разумную газету, то займее сапраўднага сябра, надзейнага дарадцу і, калі хочаце, нават памочніка ў сваім паўсядзённым жыцці.*

Я, напрыклад, пенсіянерка, прычым з досыць вялікім «стажам». Шмат што памятаю з нашага ранейшага жыцця, з перыяду, які цяпер называюць «саўковым». Газеты ды часопісы, што і казаць, былі тады больш даступныя, але ж пры гэтым ці не ўсе яны выглядалі як блізняты, бо рабіліся на адзін капыл. Вось і атрымлівалася, што людзі — то па добрай волі, то пад прымусам — іх выпісвалі, а чытаць — не чыталі. Мяне ў той час нават ад «Звязды» неяк адвярнула. Ды і не да газет было, не да чытання.

Вярнуцца да яго падштурхнула любімая тэлепраграма «Размаўляем па-беларуску», якую вядзе Алена Трацэнка. Менавіта яна параіла звярнуць увагу на матэрыялы «Звязды». Пасля гэтага я разоў колькі купіла яе і прыемна здзівілася: гэта было ўжо іншае выданне — сапраўды народная газета, бо на роднай мове.

Выпісваць іх, як некалі — рэспубліканскую, абласную, раённую, пару часопісаў, — большасці пенсіянераў (ды і працуючых) цяпер не па кішэні, — працягвае шаноўная Ніна Андрэеўна. *— Даводзіцца выбіраць адно-два выданні, якія найбольш патрэбны, да якіх ляжыць душа. Для мяне вось такім і стала «Звязда». Без яе цяпер ніяк не ўяўляю свайго існавання.*

Разумею, што за кожным нумарам газеты — праца калектыву, відаць, нялёгкая і няпростая, бо чытаюць «Звязду» людзі рознага інтэлектуальнага ўзроўню. І трэба ж, каб кожны знайшоў для сябе нешта цікавае і патрэбнае, каб людзі ведалі аб падзеях дзяржаўнай важнасці, аб з'явах у культуры і мастацтве, аб жыцці беларускай глыбінкі... Ёсць у «Звяздзе» і парады для гаспадароў, для гаспадынь. Словам, выпісаўшы гэту газету, я асабіста не маю патрэбы нешта шукаць у іншых».

І яшчэ на адну акалічнасць звяртае ўвагу наша чытачка з Петрыкава. *«У краіне шмат пенсіянераў. Далёка не ў кожнага жыццё склалася добра,* — піша Ніна Андрэеўна. *— Бывае, што чалавек як быццам жыве сярод людзей, а пачуццё адзіноты сыходзіць ад яго вельмі рэдка, хіба тады, калі з некім блізкім размаўляе, глядзіць што цікавае па тэлевізары, назірае за прыродай, чытае газету. Я, напрыклад, вельмі палюбіла звяздоўскую рубрыку «Алё, народ на провадзе!». І вось гэта любоў да народа і роднай мовы зрабіла маё жыццё не такім самотным і нават разнастайным. Вольны час я цяпер запаўняю тым, што чытаю «Звязду», што сама прыпамінаю розныя гісторыі, каб напісаць у газету».*

Што і казаць, пошта ў «...Народа на провадзе» сапраўды багатая (толькі б не сурочыць!). І гэта нягледзячы на тое, што рубрыцы не тры гады і нават не дзесяць... За апошнія васямнаццаць (!) на старонках «Звязды» выйшлі сотні (а можа, і тысячы?) «праўдзівых і вясёлых гісторый»! А ўжо вершаў з прыпеўкамі на конкурс «Хто каго?» дык і ўвогуле безліч! З імі, відаць, як з добрай крыніцай: чым больш з яе чэрпаеш, тым больш прыбывае. У тым ліку — што вельмі прыемна! — і новых аўтараў.

«Я — просты рабочы, працую на водаканале, — піша **спадар Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка.** *— Мой абавязак сачыць, каб да людзей даходзіла чыстая вадзіца. Многія п'юць яе і зусім не задумваюцца, што нехта там дзяжурыць, выклікае, калі трэба, аварыйныя брыгады, часам нешта рамантуе. І гэта правільна...*

У вёсцы ў нас з жонкай ёсць домік. Прыходзіцца мець справу з усялякай жыўнасцю (авечкамі, курамі, катамі, сабакамі), з зямелькай... Часу вольнага зусім няшмат. Тады я люблю іграць на баяне, спяваць, з задавальненнем чытаю «Звязду». Падзіўлюся, бывала, як складна пішуць іншыя, і самому штось прыйдзе ў галаву...»

На першы раз Мікалай Мікалаевіч даслаў у рэдакцыю ну вельмі цікавы подпіс да чарговага конкурснага здымка! Але ж іх (ды, спадзяемся, іншыя творы новага аўтара) мы надрукуем пазней. Пакуль жа...

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Адданыя падпісчыкі «Звязды» сужэнцы ПЯШЭВІЧЫ з вёскі Юркевічы Жыткавіцкага раёна.

«Маё блізкае сяброўства з газетай пачалося гадоў 17 таму: пастаянна выпісваю, чытаю, шмат карыснага знаходжу ў рубрыках «Крынічка», «Радзіннае», «Хатняя энцыклапедыя». Некалі раней удзельнічала ў розыгрышы прызоў, — **піша Алена Куган з мястэчка Глінішча Хойніцкага раёна.** *— А вось мая мама Галіна Рыгораўна дык нават выйгравала. Я добра помню, як тады знайшлі ў газеце купон, як выразалі і выслалі яго ў рэдакцыю, і як праз нейкі час кума (яна прачытала першай) паведаміла нам пра тое, што мама выйграла пару парасят.*

Для нашай сям'і гэта было і прыемнай неспадзяванкай, і добрай падмогай, бо нашы бацькі — людзі працавітыя, гаспадарлівыя. Так што парасят, вядома ж, выгадавалі.

На вялікі жаль, таты з намі ўжо няма, а вось мама па-ранейшаму гаспадарыць. Мы з сястрой стараемся як найчасцей прыязджаць да яе, па магчымасці дапамагаць і, вядома ж, частавацца там рознай смакатой з печы. У мамы (яна доўгі час працавала загадчыцай у школьнай сталоўцы) атрымліваюцца цудоўныя баршчы, кашы, бліны і шмат чаго іншага, бо гэта — са сваёй гародніны, свайго мяса і малака. Мама трымае карову, курэй, і ў нас па-ранейшаму вядуцца парасяты...

А ў вольныя хвіліны, якія выпадаюць не так і часта, мы любім чытаць. Дзякуючы «Звяздзе» я ведаю, што адбываецца ў краіне і свеце, як складваюцца лёсы ў розных людзей, цікаўлюся гараскопамі, рубрыкай «Усміхнемся»...

Шмат разоў мне прапаноўвалі выпісаць іншыя газеты, але ў мяне самой жадання такога не ўзнікала ні разу. Я ўжо неяк зраднілася са «Звяздой».

Як зрадніўся, відаць, і **спадар Лявон Анціпенка.** *«Некалі ў Шклове,* — піша ён, *— пачала выходзіць раённая газета «Ударны фронт». Я прыйшоў туды літсупрацоўнікам і з таго ж 1963 года стаў пастаянна выпісваць «Звязду». За гэты час мноства разоў пераконваўся, што газета не толькі цікавая, але і карысная. Заўжды чытаю першую старонку, ніколі не прапускаю артыкулаў «Жырандолі» і «Краіны здароўя». Дзякуючы апошнім нават пазбавіўся ад многіх хвароб... Словам, не адмаўляўся ад газеты раней, не збіраюся адмаўляцца і зараз».*

Яшчэ і таму, што «Звязда», як прызнае **спадар Шпак з Гродна,** *— найлепшая з газет, бо яна вяртае нас у маленства, у бацькоўскую хату, да родных людзей, з якімі размаўляў па-беларуску».*

Згодны — цяпер не дужа паразмаўляеш, бо многім і сапраўды няма з кім. *«Беларусь — адна з нямногіх краін з дзвюма дзяржаўнымі мовамі, але ж першая, мова карэннага насельніцтва,* — піша **спадарыня Вольга Трыгубовіч з Мінска,** *— існуе, хутчэй, як дыялект. Мы цягнемся да нейкай прыдуманай моды, адмаўляемся ад свайго, роднага, ад мовы дзядоў і прадзедаў, пераходзім на «трасянку», у тым ліку — і ў галаве. Усё паводле жарту: «Еду ў Мінск — ляжыць палена, з Мінска еду — «нет бревна». А на маю думку, чалавек не павінен ламаць сябе: калі ён беларус, то і размаўляць павінен на роднай мове. Можа, тады і адносіны паміж людзьмі будуць цяплейшымі, і разуменне поўным...»*

А сам народ, дададзім, адметным. Прычым адметным не тым, што адмаўляецца ад роднай мовы, а, як іншыя, — трымаецца яе.

...Што да гэтага можна дадаць? Хіба тое, што большасць лістоў на тэму падпіскі пачынаецца са слоў: «Добры дзень, «Звязда» (з эпітэтамі шаноўная, паважаная, любімая, найстарэйшая... Газета, з якой пяць разоў на тыдні прыемна вітацца, родная на роднай мове і г. д.).

Чым завяршаюцца гэтыя лісты? Калі агулам, то: *«Даражэе ўсё, у тым ліку і газеты,* — канстатуе **спадар Станкевіч з Мінска.** *— Можна, здавалася б, выпісваць нешта таннейшае. Але што там чытаць? Праграму тэлеперадач? Не, лепш ужо са «Звяздой».*

А таму шчыры дзякуй усім, хто падпісаўся, хто плануе гэта зрабіць, хто на Каляды і Новы год хоча падарыць сваім родным і блізкім падпіску. Бо са «Звяздой», як сведчыць пошта, і сапраўды цяплей. Ды і святлей. Нездарма ж менавіта яе як сімвал сонца насілі і дагэтуль носяць калядоўшчыкі.

І паштальёны, будзем спадзявацца, таксама.

Так ці не?

«...ШТО НАМ РАБІЦЬ З НЕДАХОПАМІ?»

Сёння ў нашай пошце пытанні пра тое, ці можна трапіць у «корак» па дарозе дадому? Ці лёгка «раскусіць» моцны арэх? І як перакласці на нашу мову рускае «устранять недостатки»?

На моўныя пытанні чытачоў, як заўжды, адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.

1. Слова **корак** у беларускай мове, вядома ж, ёсць. Але яно абазначае або 'вонкавы адмерлы слой кары некаторых раслін', або 'затычку для бутэлек і іншага падобнага посуду', або 'абцас' (уст.). У значэнні 'скучанасць людзей, транспарту або іншых прадметаў, якія перамяшчаюцца ў адным напрамку, а таксама затрымка руху ў месцах такой скучанасці' слова корак сталі ўжываць апошнім часам, відаць, пад уплывам польскай мовы, дзе ў назоўніка korek ёсць адпаведнае значэнне. Аднак «перацягваць» яго ў беларускую... Навошта, калі ў нашай мове ёсць добра вядомы назоўнік **затор**?

Яго мы і раім для выкарыстання.

2. Ёсць у беларускай мове ўстойлівы выраз са словам арэх, арэшак. Часам узнікаюць спрэчкі наконт таго, які ён: моцны, цвёрды ці ўвогуле крэпкі? Адказваем: правільныя варыянты — першыя два: цвёрды і моцны. Так называюць або нешта недаступнае, цяжкае для авалодання ім (можна сказаць, напрыклад, што *гэта крэпасць для ворага аказалася цвёрдым арэшкам*), або чалавека, які не паддаецца ўплыву іншых, застаецца стойкі ў сваіх перакананнях, мае моцны характар (напрыклад, правільным будзе сказ *Стары не паддаваўся на ўгаворы, і ўсе прызналі, што ён сапраўды моцны арэшак*).

Апошнім часам (не без уплыву вядомага фільма з Брусам Уілісам) так могуць называць і проста фізічна моцнага чалавека.

3. Фразы накшталт *ухіляць недахопы* і сапраўды сустракаюцца вельмі часта. Ці то праз няўдалае выкарыстанне сістэм машыннага перакладу (якія так перадаюць рускае *устранять*), ці то з нейкіх іншых прычын у нас сталі *ўхіляць бар'еры, перашкоды, нават канкурэнтаў...*

Тут трэба адзначыць, што ў сучаснай беларускай мове ўжываецца толькі дзеяслоў **ухіляцца**. А ў прыведзеных прыкладах на месцы *ўхіліць* павінны быць іншыя словы: **знішчыць бар'еры, прыбраць з дарогі перашкоду, абысці канкурэнтаў, ліквідаваць недахопы.**

У абарону слоў

З'яўленне новых сродкаў выказвання думкі нармальная рэч для кожнай жывой мовы. Аднак трэба памятаць, што штучнае ўвядзенне ў яе слоў, якія абазначаюць паняцці, ужо «занятыя» іншымі словамі, — як правіла, сэнсу не мае. Прыклад? Калі ласка. Слова **посолъ** з асноўным значэннем — 'дыпламатычны прадстаўнік, пасланы ў іншую дзяржаву з пэўнай місіяй' было яшчэ ў старабеларускай мове. У 20-я гады мінулага стагоддзя аўтары «Расійска-беларускага слоўніка» рускае *посол* пераклалі беларускім *пасол* (без якіх-небудзь іншых варыянтаў). У 1929 годзе ў Вільні пабачыў свет «Падручны беларуска-польскі слоўнік», аўтар якога Браніслаў Друцкі-Падбярэскі падаў гэтае слова па-іншаму:

пасол [pasol] — posel, ambassador.

Як бачым, у беларускай частцы (злева) стаіць пасол (і вымаўленне гэтага слова лацінкай), а ў польскай (справа) ужо пададзены і ambassador, якім сёння часам замяняюць нашага пасла.

Такім чынам, здаецца, даволі ясна відаць, што слова пасол — сваё, значыць, пазбягаць і асцерагацца яго ўжывання няма ніякіх прычын.

Смех смехам

Якім ты быў...

Снежань, зіма, а з ёю — міжвольны ўспамін.

Вясковыя дзеці часам прапускалі заняткі ў школе, заставаліся дома, каб дапамагчы бацькам то бульбу пасадзіць ці выбраць, то кароў адпасвіць... Настаўнікі да такіх прагульшчыкаў ставіліся з разуменнем. Але ж вучні часам злоўжывалі, калі-нікалі прапускалі ўрокі без дай прычыны. Вось і Андрэй тым разам замест школы матнуўся ў горад.

Назаўтра класны кіраўнік спытала, чаму ён не быў на занятках?

— Пасвіў кароў, — адказаў хлопчык.

Клас аж паехаў ад рогату, бо на дварэ — зіма.

А настаўнік вазьмі ды скажы:

— Мусіць, новую пароду вучоныя вывелі? Бач, па снезе пасвяцца.

З гэтага дня да Андрэя прыляпілася мянушка Пастух. З ёй хлопец скончыў школу, з ёй адслужыў у войску... І цяпер жыве — здаецца, не крыўдуючы? Бо вінаваты ў тым толькі сам.

С. Я. Атрохава,

в. Селішча, Слуцкі раён.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

ХТО ГАЛОЎНЫ Ў АБЛОКАХ?

Пальма Ізраіля

Таму сёння многія краіны свету вядуць барацьбу за тое, каб заняць на рынку беспілотных авіяцыйных сістэм (БАС) вядучыя пазіцыі. Калісьці Савецкі Саюз, які меў каласальны вопыт у стварэнні самалётаў і касмічных караблёў, праводзіў паспяховыя выпрабаванні розных канструкцый беспілотнікаў. У прыватнасці, гэтым займаліся КБ Сухога і Тупалева. Але развал дзяржавы надоўга пахаваў іх унікальныя распрацоўкі. На працягу апошніх гадоў Расія імкнецца аднавіць галіну, але пакуль не вельмі ўдала.

Тым часам пальму першынства ў вытворчасці і продажы беспілотнікаў захапіў Ізраіль. На яго долю прыпадае звыш паловы ўсіх БЛА, якія прадаюцца на сусветных рынках. Другое месца па гэтым паказчыку цвёрда ўтрымліваюць ЗША — амаль чвэрць такіх машын. Трэцяе — за Канадай, хоць яна значна адстае ад лідараў.

У апошнія гады канкурэнцыю ім пачынае ствараць Кітай, дзе на сённяшні дзень вырабляюцца беспілотнікі ўсіх тыпаў — ад ударных (здольных паражаць розныя аб'екты) да здымачна-гульнявых квадракоптараў. Па вытворчасці апошніх, дарэчы, кітайцы ўжо апярэдзілі ўсіх.

Сюрпрыз ад Беларусі

Тое, што ў падобнай справе багатыя і развітыя дзяржавы вырваліся наперад, нікога не здзіўляе. Уражвае іншае: якім чынам наша Беларусь, не маючы значнага вопыту ў канструяванні і вытворчасці самалётаў, абмежаваная ў сродках, раптам апынулася сярод краін, якія валодаюць тэхналогіямі стварэння беспілотных лятальных апаратаў? І не проста валодаюць, а паспяхова прымяняюць іх на практыцы. Ды так, што шэраг куды больш моцных прамысловых дзяржаў з намі тут, як кажуць, і побач не стаялі.

Адказ на гэта пытанне карэспандэнт «Звязды» атрымаў пасля наведвання Навукова-вытворчага цэнтра шматфункцыянальных беспілотных комплексаў Нацыянальнай акадэміі навук. Яго **дырэктар і галоўны канструктар Юрый ЯЦЫНА** расказаў, як дзесяць гадоў таму ён разам з двума аднадумцамі вырашыў заняцца стварэннем беспілотных авіяцыйных сістэм. Пачыналі з нуля, бо да таго часу ў краіне ніхто да такіх распрацовак нават не набліжаўся. Таму кожны крок энтузіястам даваўся з крывёй: не на жарт сварыліся з начальствам і паміж сабой, пакутавалі ад няхваткі грошай і кваліфікаваных паплечнікаў, рабілі памылкі, адну за другой цярпелі няўдачы, аварыі, пакуль нешта не пачало атрымлівацца. Пачатковыя мадэлі мелі істотны недахоп: відэакамеру ў паветры боўтала разам з лёгкім крылатым апаратам, што рабіла знятую ў палёце карцінку вельмі дрэннай. Тады інжынеры павялічылі вагу носьбіта і зрабілі так званую гірастабілізаваную відэасістэму. Гэта ўжо быў правобраз першай канструкцыі беспілотнікаў сямейства «Буслоў», якія пазней сталі вядомымі далёка за межамі Беларусі. А спачатку іх заказала наша Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Машыны зарэкамендавалі сябе як вельмі надзейныя і карысныя. Прафілактыка пажараў, дзякуючы няспыннаму патруляванню лясных угоддзяў, палепшылася ў разы.

Канешне, поспех быў забяспечаны тым, што на пэўным этапе работы невялікую групу інжынераў-канструктараў пад кіраўніцтвам Юрыя Яцыны заўважылі на ўзроўні ўрада і падтрымалі. Паступова да праграмы распрацоўкі і выпуску беспілотных лятальных апаратаў прыцягнулі таленавітых матэматыкаў, фізікаў, электроншчыкаў, праграмістаў, людзей іншых спецыяльнасцяў, якія змаглі даказаць высокі ўзровень айчыннай інжынерна-канструктарскай і навуковай школы. За неверагодна кароткі тэрмін у цэнтры, дзе цяпер працуюць каля сотні чалавек, змаглі стварыць шэраг разнастайных тыпаў беспілотнікаў, якімі можна па праве ганарыцца.

Сямейства «Буслоў»

Гэтыя апараты вагой усяго да 14 кілаграмаў прызначаны для відэаманіторынгу мясцовасці і розных аб'ектаў, у тым ліку рухомых, і перадачы карцінкі з адпаведнымі каардынатамі на наземны пункт кіравання ў рэжыме рэальнага часу. Апошняя мадэль «Бусел М-50» здольная выконваць пастаўленыя задачы на вышыні да пяці тысяч метраў з хуткасцю палёту 60—100 кіламетраў у гадзіну. Прычым запускацца яна можа як з катапульты, так і з рукі. Пасадка ажыццяўляецца з дапамогай парашута. А калі прымяняць такую «птушку» на караблі, то для яе лоўлі выкарыстоўваецца спецыяльная палубная сетка.

«Буравеснік»

Апарат важыць звыш 300 кілаграмаў і развівае хуткасць да 140 км/г. Узлятае і садзіцца як самалёт. Як і «Бусел», абсталяваны інфрачырвонай камерай, таму можа весці разведку і ў цёмны час сутак. Паспяхова прымяняецца, у прыватнасці, для барацьбы з браканьерамі, правядзення мерапрыемстваў па ліквідацыі надзвычайных здарэнняў, замеру ўзроўню радыяцыйнага забруджвання мясцовасці. У аўтаномным рэжыме можа праляцець да тысячы кіламетраў, знаходзячыся ў паветры каля шасці гадзін з грузам да 60 кілаграмаў. Такая працаздольнасць прыцягнула ўвагу замежных ваенных.

«Ястраб»

Зараз зроблена мадэль, якая ў залежнасці ад пажаданняў пакупніка можа быць і дронам, і самалётам з пілотам *(на фота побач Юрый Яцына)*. Выкарыстоўваецца ў тым жа амплуа, што і «Буравеснік, толькі з больш высокай эфектыўнасцю, бо машына здольная ляцець з хуткасцю да 220 км/г і браць на борт да 120 кілаграмаў. Прынцыпова адрозніваецца ад іншых мадэляў тым, што пасля дапрацовак можа прымяняцца таксама для вучобы авіятараў.

БАК на базе дырыжабля

Калі заказчыкам спатрэбілася ўзняць у неба дастаткова габарытнае абсталяванне, супрацоўнікі цэнтра прапанавалі беспілотнік-дырыжабль, напоўнены геліем. Канструкцыя атрымалася вельмі ўдалай. Апарат рухаецца не хутка, не хутчэй за 40 км/г, а пры неабходнасці мае магчымасць наогул завісаць у паветры. Пры такім рэжыме яго высакаякасная відэатэхніка робіць падрабязныя здымкі зямной паверхні і аб'ектаў, а вымяральныя прыборы і датчыкі маніторацъ экалагічны стан навакольнага асяроддзя. Найбольшага эфекту дырыжаблі дасягнулі ў кантраляванні лясных масіваў, міграцыі дзікіх жывёл і замерах радыяцыі ў цяжкадаступных месцах.

Найлепшы ў сваім класе

Сёння распрацоўкай і вытворчасцю беспілотнікаў у тых ці іншых маштабах займаюцца дзясяткі краін. Але, як адзначаюць нашы спецыялісты, сканструяваць і сабраць такі апарат — гэта адно, а прымусіць яго надзейна і якасна выконваць пастаўленыя задачы — зусім іншае. Выставіць на рынак сапраўды годную тэхніку ўдаецца даволі абмежаванай колькасці яго ўдзельнікаў. У падтрымку гэтай думкі Юрый Яцына нагадвае міжнародную выстаўку беспілотных сістэм у Абу-Дабі, што адбылася на пачатку года. Там свае найлепшыя дасягненні дэманстравалі 135 кампаній з 64 дзяржаў. Было шмат бліскучых прэзентацый, гучных заяў, але калі справа дайшла да практычнага паказу функцыянальных магчымасцяў БЛА, то да палётаў перад усімі кіраўнікамі афіцыйных дэлегацый распараджальнікі дапусцілі машыны толькі з трох краін: ЗША, Аўстрыі і Беларусі. Айчынныя сістэмы зарэкамендавалі сябе з найлепшага боку. Па выніках форуму арганізатары прызналі наш «Бусел М-40» найлепшым у сваім класе.

Экзамен на сталасць

— Наогул, — расказвае Юрый Францавіч, — у наш час ніхто не будзе купляць нават самую разрэкламаваную машыну проста так. Патэнцыйны пакупнік запросіць вытворцу ў сваю краіну і прапануе на месцы паказаць, як будзе паводзіць сябе канкрэтная мадэль. Паверце, што нямногія вытрымліваюць такі экзамен. Асабліва там, дзе складаныя прыродныя ўмовы. Бываючы ў розных кутках планеты, мы не раз назіралі стэпы, пустыні, засыпаныя разбітымі беспілотнікамі. Нашы ж канструкцыі, скажу шчыра, вельмі жывучыя. Таму імі едуць цікавіцца з-за мяжы амаль кожны тыдзень. Не заўсёды такія кантакты трансфармуюцца ў канкрэтныя дамоўленасці, але пэўныя поспехі ў наладжванні экспарту прадукцыі цэнтра ёсць. Напрыклад, нашы беспілотнікі закупілі Туркменістан, Расія і В'етнам. Упэўнены, хутка будуць і іншыя цікавыя кантракты. У тым ліку і на беларускім рынку, дзе сёння працуюць каля сотні разнастайных дронаў. Наша прадпрыемства з'яўляецца самым перадавым у вытворчасці БАС. Мы задаволены тым, што падобнымі распрацоўкамі займаюцца яшчэ некалькі беларускіх кампаній, у прыватнасці Баранавіцкі авіярамонтны завод, сталічныя «АГАТ» і «КБ ІНДЭЛА». Канкурэнцыя толькі дапамагае трымацца ў тонусе і не зніжаць абароты.

Не адсякай крыло, на якім ляціш

— Аднак гэта ж яшчэ і барацьба за дзяржаўнае фінансаванне? — пытаюся ў суразмоўніка, здзіўляючыся яго лаяльнасцю да канкурэнтаў.

— Дзяржава, канешне, дапамагае, але на вельмі канкрэтных умовах. Калі ты бярэш у яе, напрыклад, 100 рублёў, то павінен на працягу трох гадоў прадаць сваёй прадукцыі як мінімум на 500. У адваротным выпадку грошы ў казну прыйдзецца вярнуць. Да таго ж вымушаны адзначыць, што дзяржава не толькі дапамагае... Зараз растлумачу. БЛА — гэта не проста фюзеляж і крылы, а цэлая сістэма з бартавой электронікай, аўтапілотам, сродкамі сувязі і г. д. Кіраваць такім шматфункцыянальным дронам і атрымліваць ад яго інфармацыю на адлегласці ў сотні кіламетраў можна толькі з дапамогай радыёсігналаў. Дык вось, у Беларусі для гэтага выдзелены далёка не самы лепшы дыяпазон частот. Нават калі нейкая арганізацыя захоча купіць беспілотнік, а ён каштуе нямала, то адразу задасць пытанне аб гарантаванай бесперабойнай сувязі. Мне здаецца, спецыяльная камісія па радыёчастотах, ад якой залежыць гэтае пытанне, даўно павінна вырашыць яго на карысць айчыннай эканомікі. Бо за беспілотнікамі будучыня, і мы павінны зрабіць усё магчымае, каб дадзеная галіна развівалася як мага больш хуткімі тэмпамі. На жаль, гэтаму не спрыяе і іншая праблема. У Беларусі нідзе не рыхтуюць спецыялістаў для такога высокатэхналагічнага кірунку. Рызыкуем спазніцца.

На беспілотніку — па эканомію і прыбытак

Юрый Францавіч так і не сказаў, колькі ж каштуюць айчынныя беспілотнікі. Камерцыйная тайна. Але адзначыў, што эканомія, якую можа мець дзяржава з дапамогай такіх апаратаў, намнога перавышае выдаткі на іх набыццё.

І з гэтым не паспрачаешся. Нядаўна падчас аднаго пралёту дрона над тэрыторыяй Налібоцкай пушчы было выяўлена адразу пяць «заводаў» самагонаварэння. А хто-небудзь можа ўявіць, колькі крыніц уцечкі цяпла і газу можна засекчы, калі паставіць такую задачу беспілотніку, узброенаму інфрачырвонай відэакамерай, і запусціць яго над начным горадам? А прафілактыка лясных пажараў? А дасканалае земляробства, да якога мы абавязкова прыйдзем? Ужо сёння многія аграрныя фірмы за мяжой выкарыстоўваюць квадракоптары для абследавання палёў, падкормкі раслін і іх хімічнай апрацоўкі менавіта на тых участках, дзе гэта патрабуецца. Тым самым дасягаецца велізарная эканомія насення, угнаенняў, пестыцыдаў.

Дарэчы, арганізацыі, якія займаюцца эканамічным аналізам і прагнозам, прыйшлі да высновы, што сусветны рынак беспілотнікаў у 2020 годзе складзе амаль 130 мільярдаў долараў. Большая частка БЛА будзе прымаць удзел у інфраструктурных праектах і сельскай гаспадарцы. Канешне, вялікую колькасць дронаў накіруюць у армейскія фарміраванні. Верым, што сваю нішу на гэтым перспектыўным рынку зойміуць і беларускія распрацоўшчыкі беспілотных авіяцыйных сістэм.

Міхаіл КАВАЛЁЎ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

МОСКВА МИНСК БАНК

ОТЧЕТ
О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«АВТО СМАРТ!»

Место и дата составления отчета:
13.12.2018 г.
г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328.
1. Организатор: общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328, УНП 190624910.
2. Наименование рекламной игры – «Авто СМАРТ!».
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3332 от 25.07.2018 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.
4. Срок начала рекламной игры: 1 августа 2018 г.
Срок окончания рекламной игры: 20 декабря 2018 г.
5. Количество участников рекламной игры: 2 883 человек.
6. Призовой фонд разыгран полностью.
7. Победитель рекламной игры:
Дерюжина Елена Леонидовна, г. Могилев.
Выигрыш: автомобиль легковой RENAULT KAPTUR, Россия, кузов № X7LASREA160341919, г. в. 2018, цвет – белый, стоимостью 28 900,00 (двадцать восемь тысяч девятьсот белорусских рублей 00 копеек) и денежное вознаграждение в размере 4 300,16 белорусского рубля.
Дата выдачи выигрыша 21.11.2018 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 49.
8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (17) 209-90-03.
9. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было. Жалоб организатору и комиссии не поступало.
Директор Д. В. Носик

Скажыце, доктар

НЕБЯСПЕЧНАЕ ПЕРААХАЛАДЖЭННЕ

Халодныя месяцы года — час, калі жанчынам трэба быць асабліва ўважлівымі да свайго здароўя. Наш арганізм вельмі ўразлівы і рэзка рэагуе на паніжаную тэмпературу навакольнага асяроддзя. Што павінна ведаць кожная жанчына, якія меры варта прыняць, каб не захварэць, калі вы замерзлі ці прамоклі, а таксама якія сімптомы запаленчага працэсу павінны насцярожыць і чаму ў такім выпадку нельга марудзіць з візітам да доктара, расказала акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска, клінічны ардынатар кафедры акушэрства, гінекалогіі і рэпрадуктыўнага здароўя Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святлана КРЭЕР.

— Чаму прадстаўніцы прыгожага полу больш, чым мужчыны, схільныя да пераахаладжэння?

— Гэта звязана з анатамічнымі асаблівасцямі мачавой і рэпрадуктыўнай сістэм. Мужчыны ў гэтым плане «выйграюць», яны больш абаронены, бо мочаспускальны канал у іх у пяць разоў даўжэйшы, чым у жанчын. З-за кароткай урэтры патагенныя і ўмоўна патагенныя мікраарганізмы ў спрыяльнай для іх сітуацыі, напрыклад пры пераахаладжэнні, лёгка пранікаюць з геніталій у мочавыдзяляльную сістэму і наадварот, правакуючы захворванні.

— Пераахаладжэнне магчымае, калі на вуліцы мароз -15, а мы ў тонкіх калготках?

— На самай справе жанчыны схільныя да пераахаладжэння нават летам. Нездарма папярэджанне «не сядзі на халодным» перадаецца ад матуль і бабуль да дачок і ўнучак. Правакуючыя фактары самыя розныя: купанне ў вадаёме з тэмпературай ніжэй 18 градусаў, доўгае знаходжанне ў мокрым купальніку, невыкананне правіл асабістай гігіены.

— Атрымліваецца, што нізкая тэмпература — небяспечны вораг жаночага арганізма...

— Тэмпература — толькі спрыяльны фактар для развіцця захворванняў. Наш імунітэт залежыць ад навакольнага асяроддзя. Падчас пераахаладжэння ахоўныя сістэмы арганізма слабеюць. Патагенныя і ўмоўна патагенныя мікраарганізмы актывізуюцца, і ёсць усе шанцы захварэць. Канешне, усё вельмі індывідуальна. Загартаваныя людзі больш устойлівыя да такіх працэсаў. А менш загартаваныя больш схільныя да хвароб.

— Як сябе праяўляе запаленчы працэс? Што мы адчуваем?

— На тое, што з арганізмам адбываецца нешта нядобрае, указваюць рэзі падчас мочаспускання і частыя да яго позывы, непрыемныя выдзяленні з палавых шляхоў, боль у вобласці паясніцы і ўнізе жывата. Калі ўсё гэта суправаджаецца павышанай тэмпературай, слабасцю, стамляльнасцю, болямі ў ніжніх аддзелах спіны пры лёгкім пастукванні, значыць, інфекцыя падымаецца на «верхні паверх». І ўзнікае запаленне нырак, прыдаткаў. Запаленчы працэс у матачных трубах вядзе да іх спайвання, узнікае непраходнасць. Гэта правакуе бясплоддзе. Зразумела, што такія ўскладненні здараюцца далёка не заўсёды. Тым не менш любы з пералічаных сімптомаў — сігнал да таго, каб звярнуцца да ўрача. Калі па нейкіх прычынах жанчына марудзіць са зваротам да спецыяліста, вялікая імавернасць пераходу захворвання ў лік хранічных.

— Якія захворванні вы маеце на ўвазе?

— Часцей за ўсё ў выніку пераахаладжэння ўзнікаюць цыстыт (запаленне мачавога пухіра), аднэксіт (запаленне прыдаткаў — яечнікаў і матачных труб). З боку мочавыдзяляльнай сістэмы гэта ўрэтрыт (запаленне мочаспускальнага канала). Калі працэс ідзе далей і захоплівае ныркі, мы вядзём размовы пра піеланефрыт. Таму па дапамогу варта звяртацца неадкладна. На першым прыёме неабходны агляд, аналізы і, магчыма, спатрэбіцца ультрагукавая дыягностыка. Толькі пасля гэтага пацыентцы ставіцца дыягназ і пачынаецца лячэнне.

— Якую першую дапамогу мы можам аказаць сабе да візіту да доктара? Ці сапраўды так карысны журавінавы морс, які многія раяць?

— Не трэба займацца самалячэннем, калі вас нешта непакоіць. Калі проста замерзлі ці вымаклі, важна хутчэй зняць мокрае адзенне, сагрэцца, ухутаць ногі, выпіць цёплай гарбаты. Для прафілактыкі запаленчага працэсу сапраўды можна ўжываць морс з журавін. Даказана, што рэчывы, якія ўваходзяць у склад гэтай ягады, перашкаджаюць прымацаванню шкодных бактэрый да сценкі мачавога пухіра.

Прафілактыка пераахаладжэнняў — гэта правільна падабранае цёплае адзенне і абутак. Памятайце, што апранацца варта па надвор'і. Аматаркам кароткіх спадніц і тонкіх калготак зімой варта аддаваць перавагу доўгаму верхняму адзенню і тэрмабялізне.

Важна прытрымлівацца пітнога рэжыму. Калі арганізму не хапае вады, канцэнтрацыя бактэрый у мочавыдзяляльнай сістэме імкліва ўзрастае. Гэта звязана з тым, што мача, якая вымывае хваробатворныя мікробы, выпрацоўваецца ў мінімальнай колькасці. Каб пазбегнуць абвастрэння цыстыту, трэба піць порцыямі 200—300 мілілітраў на працягу дня.

Шмат залежыць і ад нашага імунітэту. А яго фарміруюць здаровы лад жыцця, паўнавартасны сон, харчаванне, генетыка, навакольнае асяроддзе. Перад тым як загартоўвацца, лепш парайцеся з урачом. І канешне, не забывайце рэгулярна наведваць гінеколага. Урач яшчэ на даклінічным этапе выявіць схаваныя інфекцыі і своечасова прызначыць лячэнне, дзякуючы якому можна пазбегнуць ускладненняў.

Калі згубілася амбулаторная карта...

Як знайсці звесткі пра прышчэпкі

Апошнім часам шмат кажуць пра неабходнасць прышчэпак, у прыватнасці ад такой небяспечнай інфекцыі, як адзёр. Але як даведацца, ці рабілі іх у далёкім для многіх дзяцінстве? Што рабіць, калі некалькі гадоў таму пераехалі ў іншы горад і замацаваліся за новай паліклінікай і звестак аб прышчэпках няма? Нарэшце, медыцынская карта разам з пералікам прышчэпак магла згубіцца... Рабіць іх зноў ці ўсё ж ёсць спосаб знайсці пра іх звесткі? Аб гэтым мы распыталі загадчыка аддзялення імунапрафілактыкі Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Марыну КАЧКАН.

— Марына Віктараўна, як даведацца пра свой прышчэпкавы статус, калі згублена амбулаторная карта?

— Згодна з заканадаўствам, звесткі аб выкананых прафілактычных прышчэпках уносяцца ў форму № 112/у «Гісторыя развіцця дзіцяці» (у дзяцей) ці форму № 025/у-07 «Медыцынская карта амбулаторнага хворага» (у дарослых) і форму № 063/у «Карта прафілактычных прышчэпак». Адпаведна, калі згублена амбулаторная карта, звесткі аб атрыманых прышчэпках можна атрымаць з карты прафілактычных прышчэпак, якая вядзецца ў амбулаторна-паліклінічнай арганізацыі аховы здароўя па месцы жыхарства (месцы аказання медыцынскай дапамогі).

— Калі не атрымліваецца ехаць у іншы горад і шукаць гэтыя звесткі, прышчэпкі ад таго ж адру варта рабіць наноў?

— Згодна з Нацыянальным календаром прафілактычных прышчэпак Беларусі, прышчэпкі супраць адру праводзяцца дзецям ва ўзросце 1 і 6 гадоў. Пры адсутнасці звестак аб прышчэпках супраць адру даведацца, ці ёсць імунітэт супраць гэтага захворвання, можна, здаўшы аналіз крыві. Гэта магчыма зрабіць у РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі (г. Мінск, вул. Філімонава, 23) ці ў недзяржаўным медыцынскім цэнтры — на платнай аснове. Пры нізкім узроўні імунітэту супраць адру ці яго адсутнасці рэкамендуецца зрабіць прышчэпку.

— Якія прышчэпкі рабіць, калі звесткі пра іх не ўдалося знайсці?

— Пералік прафілактычных прышчэпак рэгламентаваны Нацыянальным календаром прафілактычных прышчэпак Беларусі. Інфармацыя пра іх размешчана на афіцыйным сайце Міністэрства аховы здароўя minzdrav.gov.by. Згодна з календаром, у нашай краіне праводзяцца прышчэпкі супраць 12 захворванняў: вірусны гепатыт В, туберкулёз, коклюш, дыфтэрыя, слупняк, поліаміэліт, гемафільная інфекцыя тыпу b (ХІБ-інфекцыя), адзёр, эпідэмічны паратыт, краснуха, пнеўмакокавая інфекцыя, грып.

ВІРУСНЫ ЗАБОЙЦА

Якія бываюць гепатыты і як імі можна заразіцца

Такое захворванне печані, як вірусны гепатыт, паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, штогод забірае больш за 171 тысячу жыццяў толькі ў Еўрапейскім рэгіёне. На сёння існуе пяць тыпаў віруса гепатыту — A, B, C, D і E. A і E перадаюцца праз ежу, ваду ці ад чалавека да чалавека, і інфекцыя, якую яны выклікаюць, хутка праходзіць, не ператвараючыся ў хранічнае захворванне. Вірусныя гепатыты B і C — вялікая праблема сучаснага свету. Яны перадаюцца праз кроў, а таксама палавым шляхам.

— Вірусным гепатытам B і C пераважна заражаюцца маладыя людзі — ва ўзросце 20—40 гадоў, — расказвае **ўрач-эпідэміёлаг Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Кастрычніцкага раёна Мінска Вольга МІХОВІЧ.** — Са ста хворых на гепатыт C у 70—90 чалавек узнікае хранічная форма. Праз 20—30 гадоў ад моманту інфіцыравання ў 20—30 % пацыентаў з хранічным гепатытам можа развіцца цыроз ці рак печані. Увогуле вірусы гепатыту B, C і D часта пераходзяць у хранічную інфекцыю, якая застаецца нявыяўленай і вядзе да цырозу ці раку. Каля 2 % тых, хто захварэў, адначасова інфіцыруюцца двума вірусамі, што выклікае яшчэ больш цяжкае паражэнне печані.

Важна

Заразіцца вірусным гепатытам B ці C можна ад чалавека — хворага ці бессімптомнага носьбіта вірыса. Ён змяшчаецца ва ўсіх біялагічных вадкасцях: у крыві, сперме, вагінальным сакрэце, сліне, мачы, грудным малацэ, поце. Для заражэння здаровага чалавека дастаткова найдрабнейшай кроплі крыві хворага — 0,0005 мл, якая нават незаўважная для нашага вока. Пры гэтым устойлівасць віруса ў навакольным асяроддзі надзвычай высокая. Пры пакаёвай тэмпературы на прадметах і паверхнях вірус захоўваецца да трох месяцаў. І можа пранікнуць у наш арганізм праз траўмы, трэшчыны, парэзы, ранкі.

Асноўны шлях інфіцыравання — палавы. А таксама кантактна-бытавы: заражэнне магчымае падчас карыстання агульным з хворым ручніком, прыладамі для галення і манікюру, іншымі прадметамі асабістай гігіены, таксама падчас ужывання ін'екцыйных наркотыкаў, нанясення татуіровак, выканання пірсінгу, манікюру і педыкюру, у прыватнасці ў непрыстасаваных месцах: у знаёмых, прыватных асоб дома, пры медыцынскіх маніпуляцыях, калі парушаны рэжым стэрылізацыі прадметаў і абсталявання.

— Метады лячэння хранічнай інфекцыі моцна прагрэсуюць апошнім часам. Дзякуючы гэтаму захваральнасць і смяротнасць скарачаюцца, — кажа Вольга Міховіч. — Хранічны гепатыт C можа быць вылечаны ў больш чым 90 % пацыентаў, а ход хранічнай інфекцыі гепатыту B удаецца эфектыўна кантраляваць. Перад намі стаіць задача — да 2030 года пакласці канец эпідэміі СНІДу, туберкулёзу і парэнтэральных вірусных гепатытаў. У сувязі з гэтым чакаецца, што колькасць новых выпадкаў вірусных гепатытаў B і C знізіцца на 90 %, а смяротнасць ад іх — на 65 %.

ПАМЯТКА ПАЦЫЕНТУ

Каб не заразіцца, важна мець адзінага палавога партнёра, выкарыстоўваць прэзерватыў, катэгарычна адмаўляцца ад ужывання ін'екцыйных наркотыкаў, асцярожна ставіцца да нанясення татуіровак, выканання пірсінгу, асабліва ў не прыстасаваных для гэтага месцах, прытрымлівацца правіл асабістай гігіены, выкарыстоўваць толькі індывідуальныя ручнікі, нажніцы, мачалкі, брытвы, памазкі, расчоскі і іншыя прадметы.

Існуе і надзейны прафілактычны сродак супраць гепатыту B — вакцына. У межах Нацыянальнага календара прышчэпка робіцца ў нас усім нованароджаным. Таксама бясплатна па месцы жыхарства такая вакцынацыя паказана кантактным з хворымі на гепатыты, хворым на гепатыт C для папярэджвання дадатковага інфіцыравання вірусам B, пацыентам аддзяленняў гемадыялізу, анкагематалагічным хворым, а таксама асобам з рызыкоўнымі паводзінамі — тым, хто мае выпадковыя палавыя сувязі, ужывае ін'екцыйныя наркотыкі і інш. Усе ахвотныя могуць зрабіць прышчэпку на платнай аснове. Абследаванне на маркеры гепатытаў B і C можна прайсці па пэўных паказаннях бясплатна, а таксама на платнай аснове.

ДАВЕДКА

У Беларусі паказчык захваральнасці на парэнтэральныя вірусныя гепатыты B і C у 2018 годзе склаў 39,54 выпадку на 100 тысяч насельніцтва і ў параўнанні з мінулым годам зменшыўся на 5 %. Сярод устаноўленых шляхоў заражэння дамінуе палавы — 31 %, немедыцынскія маніпуляцыі складаюць 9 %, ін'екцыі наркотыкаў — 8 %, кантактна-бытавы шлях — 2,5 %, вертыкальны (ад маці да дзіцяці падчас родаў) — менш за 1 %.

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

Пацярпеў ад выбуху кола

Такое здарэнне адбылося з кіроўцам лесавоза ў Кобрынскім раёне.

Мужчына атрымаў цяжкія траўмы, паведамілі ў Следчым камітэце. У Кобрынскі РАУС паступіла інфармацыя з бальніцы пра 45-гадовага мужчыну, які трапіў туды на лячэнне. Следча-аператыўная група на месцы здарэння ўстанавіла, што кіроўца лесавоза адной з арганізацый раёна перад рэйсам падкачваў кола. Адбылася яго разгерметызацыя, а затым выбух. Мужчына быў траўмаваны. Кобрынскім раённым аддзелам Следчага камітэта праводзіцца праверка. Канфіскавана тэхнічная дакументацыя, а таксама па ахове працы.

Грошы «выпарыліся» ў саўне

У Першамайскае РУУС сталіцы ад мінчаніна паступіла заява аб крадзяжы грошай, якія знаходзіліся ў кішэні штаноў. Усё адбылося ў адной з гарадскіх саўнаў.

Міліцыянеры ўстанавілі, што напярэдадні заяўнік і яго сябар вырашылі знайсці новых сяброў праз сацыяльныя сеткі. Маладыя людзі пазнаёміліся з дзвюма дзяўчатамі і запрасілі іх на спатканне ў саўну. Кампанія адзначыла знаёмства моцнымі напоямі, што прытупілі пільнасць маладых людзей. Яны без боязі пакідалі свае асабістыя рэчы без нагляду, бо новыя знаёмыя паспелі ўвайсці ў давер. У адзін момант малады чалавек выявіў прапажу грашовых сродкаў з кішэні штаноў у памеры больш за 1000 рублёў. Аказалася, што ўзбагаціцца за чужы кошт вырашыла адна з запрошаных прадстаўніц прыгожага полу — 23-гадовая непрацуючая мінчанка. Заведзена крымінальная справа, фігурантка можа атрымаць пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Утерянное Свидетельство о государственной регистрации ООО «ШтурманТех», УНП 691425119 **считать недействительным.**

«ЗАО «СМУ-77» извещает своих акционеров о том, что отдельными акционерами **04.12.2018** были поданы предложения о продаже принадлежащих им акций Общества в количестве до 1000 (одна тысяча) штук по цене 18 (восемнадцать) рублей за 1 (одну) акцию. Тел./факс 017-344-23-21.
УНП 100064641

В извещении о проведении аукциона 14.12.2018, опубликованном в газете «Звязда» **от 29.11.2018 № 230 внести следующие изменения:** в Лоте № 7: начальная цена продажи – 6 775,20 рубля, задаток – 677,52 рубля. УНП 1011276333

Внимание

В газете «Звязда» № 233 от 4 декабря 2018 г. в извещении допущена ошибка в адресе земельного участка, **правильно читать аг. Большие Мотыкалы, ул. Северная, 62.**
УНП 200177486

ОАО «Барановичхлебопродукт» извещает о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 110/С-7499, адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Притыцкого, 77, площадь 506,1 кв. м, целевое назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – Магазин. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, рампа, три крыльца. Начальная цена продажи с НДС 20 % – 619 560,00 руб. Сумма задатка – 61 956,00 руб. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 141000000005001551 площадью 0,0955 га, целевое назначение – для обслуживания здания магазина. Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земли на площади 0,0029 га (проход, проезд к земельному участку постороннего землепользователя).

Часть магазина (7,05 кв. м) арендуется ОАО «АСБ Беларусбанк» (банкомат, обменный пункт валют).

Характеристики лота 1: год постройки – 1979; фундамент – бетонный ленточный; стены и перегородки – кирпич; перекрытия – железобет. плиты; кровля – рулонная; полы – бетонные, плиточные; окна – стеклопакеты; двери – металлопластик, металл, дерево; отделка внутр. – оштукатурено, покрашено, оклеено обоями, облицовано плиткой; электричество, водопровод, канализация, отопление.

Аукцион по продаже лота 1 состоится 15.01.2019 в 14.00. Заявления на участие в аукционе принимаются не позднее 16.00 14.01.2019 г.

Продавец и организатор аукциона – открытое акционерное общество «Барановичский комбинат хлебопродуктов», Брестская обл., г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, тел./факс 8 (0163) 41-72-53. Место проведения аукционов: Брестская обл., г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, 2-й этаж, актовый зал.

Порядок оформления участия в аукционе и его проведения определяется Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже отдельных объектов, находящихся в собственности ОАО «Барановичхлебопродукт».

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости соответствующего лота перечисляется организатору аукциона на р/с BY29AKBB30120120000111300000 в филиале 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Барановичи, BIC: AKBBBY21802, УНП 200166738, получатель платежа – ОАО «Барановичхлебопродукт». Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в аукционе. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона.

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы, в том числе документы, подтверждающие оплату задатка, принимаются по адресу: г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, каб. 17 (юридический отдел) в рабочие дни с 08.00 до 16.30.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона оплатить организатору аукциона сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Договор купли-продажи с победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. Условие оплаты – в течение 5 рабочих дней с момента подписания договора. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона.

